ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ЖНІЎНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 148 (28258)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Запісацца ў «Каралі дарог»



Адзін «клік», і ты мадэль



Калі маці — школьніца

# АГУРОЧНЫЯ САКРЭТЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка вёскі Святое Жлобінскага раёна Зінаіда Мікалаеўна КУТОЎСКАЯ кансервуе на зіму маладыя агурочкі са свайго агарода.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Людзі, якія бачаць праблемы і недахопы навакол і стараюцца вырашыць іх магчымымі спосабамі, у тым ліку і праз звароты ў органы ўлады, непасрэдна ўплываюць на парадак у нашым доме. Дзеля добрай справы часам яны пішуць адразу ва ўсе інстанцыі, з-за чаго ім, бывае, лепяць кляймо «скаржніка». Аднак грамадзяне часта рупяцца дзеля агульнага інтарэсу, і іх настойлівая ўвага прымушае ўлады прыкласці больш намаганняў для ліквідацыі праблемных момантаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9928 | ▲ |
| Еўра | 2,2331 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0298 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0803 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
9 771990 763008 16148>

# АЛІМПІЙЦЫ ГАТОВЫЯ!

## Беларускі сцяг урачыста ўзняты ў алімпійскай вёсцы

**Цырымонія ўзняцця дзяржаўных сцягоў краін-удзельніц Алімпіяды-2016 прайшла ў Рыа-дэ-Жанэйра.**

Падобнае мерапрыемства заўсёды папярэднічае афіцыйнаму адкрыццю Гульняў і сімвалізуе гатоўнасць алімпійцаў краіны да ўдзелу ў спаборніцтвах.

СТАР. 3



■ Чалавек — чалавеку

# КЛУБ НА КОЛАХ,

## або Музыка з дастаўкай на дом

**Ёсць у Беларусі ціхія вёскі. Не носіцца там па вуліцах з лямантам дзятва, не гуляе моладзь, не гучаць песні. І толькі паціху дажываюць свой век састарэлыя людзі, часта адзінокія. Нават цяжка паверыць, што там, дзе сёння ўсяго сем жыхароў, раней было больш чым сто двароў. Але час ад часу нават глухія вёскі ажываюць, сюды вяртаецца музыка. Калі ў маланаселеных пунктах немагчыма стварыць дамы культуры, гэта яшчэ не азначае, што тамтэйшыя бабулі і дзядулі будуць жыць без свята. Аўтаклубы наведваюць нават тыя глыбінкі, дзе жыхароў можна пералічыць па пальцах рукі.**

Мабільныя ўстановы культуры пачалі актыўна стварацца ў межах праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Але не трэба лічыць аўтаклубы вынаходніцтвам нашага часу. І раней па Беларусі падарожнічалі падобныя ўстановы — жыхарам круцілі кіно, заезджыя артысты выступалі з канцэртамі... Сучасны клуб на колах можна параўнаць яшчэ і з сацыяльнай установай, бо адзінокім састарэлым людзям вельмі важна адчуваць увагу і падтрымку.

— Усю ноч не засну, буду вас успамінаць і дзецям патэлефаную, скажу, што я не адна — дзялілася жанчына, у вёску якой заехалі артысты.

І сапраўды такіх удзячных слухачоў, як у глыбінцы, яшчэ пашукаць трэба. Таму артысты ніколі не засмучаюцца, што працаваць даводзіцца ў палявых умовах і не такая ўжо вялікая ў іх публіка. Часам на лавачках і з дзясятак чалавек не набярэцца. Але песні будуць гучаць нават для аднаго-двух слухачоў.

Часта падчас сустрэч, арганізаваных аўтаклубам Бярозаўскага раёна, не тое што жанчыны, мужчыны выціраюць слёзы. Дзякуюць за ўвагу, за клопат і нават за вяртанне ў маладосць, калі ў іх вёсках раней людзі с песнямі бавілі вясёлыя вечары.

СТАР. 4

# ВЯЛІКАЯ РАЗМОВА АБ ЖНІВЕ

**Ход уборачнай кампаніі — у цэнтры ўвагі рабочай паездкі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведаміла прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы Наталля Эйсмант.**

За працай аграрыяў у палях учора Аляксандр Лукашэнка назіраў з верталёта. У маршруце Прэзідэнта значылася Мінская вобласць, якая, дарэчы, менавіта 3 жніўня пераадолела мільённую мяжу ў намалоце збожжа новага ўраджаю — тут убрана каля 55% плошчаў.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, агледзеў паўночна-заходнія раёны вобласці — Мядзельскі, Вілейскі, часткова Маладзечанскі і Лагойскі. Менавіта гэтыя раёны ў цэнтральным рэгіёне краіны ў сельскагаспадарчым плане заўсёды значыліся ў ліку складаных, але ў апошні час паказваюць нядрэнную дынаміку — уводзяцца ў абарот землі, якія раней не выкарыстоўваліся, вядуцца меліярацыйныя работы. Агледзеў з паветра Прэзідэнт таксама палі ў заходняй частцы Віцебскай вобласці: на сёння ў паўночным рэгіёне ўбрана пятая частка плошчаў.

Вялікая размова аб тэмпах і якасці палявых работ у графіку кіраўніка дзяржавы запланавана і на сёння. Першай тэмай рабочай паездкі Аляксандра Лукашэнкі ў Віцебскую вобласць стане ўборка збожжавых і нарыхтоўка кармоў — у краіне ў цэлым і паўночным рэгіёне ў прыватнасці. Акрамя таго, як плануецца, Прэзідэнт наведае Браслаўскі філіял Глыбоцкага малочна-кансервавага камбіната, а таксама адзін з турыстычных аб'ектаў вобласці, дзе гаворка пойдзе пра развіццё аграэкатурызму, прыцягненне інвестыцый і экспарт турыстычных паслуг.

## Здароўе работніка — самы перспектыўны напрамак

**У Слонімскім раёне прайшло выязное пасяджэнне Міжведамаснага савета пры Савеце Міністраў па фарміраванні здаровага ладу жыцця, кантролі за неінфекцыйнымі захворваннямі, папярэджанні і прафілактыцы п'янства, алкагалізму і наркаманіі і спажывання тытунёвай сыравіны і тытунёвых вырабаў.**

Адзін з прыярытэтных напрамкаў дзяржпраграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2016—2020 гады — павелічэнне працягласці жыцця людзей. Зрабіць гэта можна, у прыватнасці, за кошт фарміравання ў людзей здаровага ладу жыцця, прапаганды адмовы ад шкодных звычак, павышэння папулярнасці актыўнага ладу жыцця і спорту.

«За тымі кіраўнікамі, якія ўкладваюць сродкі ў развіццё сацыяльнай сферы, — будучыня, — адзначыла **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА**, якая прыняла ўдзел у мерапрыемстве. — Яны па-сапраўднаму клапоцяцца пра людзей. Работнік у перапынку можа наведаць медыцынскі пункт, атрымаць паслугі, за якімі яму не трэба ехаць у паліклініку, ён і яго сям'я на бясплатнай аснове могуць займацца спортам у басейне або трэнажорнай зале. Ад гэтага эфектыўнасць працы толькі павышаецца. Стварэнне такіх умоў — адзін са складнікаў прыбытковай работы прадпрыемства». Паводле слоў віцэ-прэм'ера, падобныя выдаткі, накіраваныя на стварэнне годных умоў для працы і адпачынку, акупяцца ў будучыні.

«У гэтым напрамку мы павінны працаваць пастаянна. Прычым не толькі шляхам прафілактыкі і прапаганды, але і на заканадаўчым узроўні аператыўна рэагуючы на выклікі часу», — адзначыла Наталля Качанава. У якасці прыкладу яна прывяла новы дэкрэт, які па ўсіх аспектах прыраўняе электронныя цыгарэты, якія атрымалі велізарную папулярнасць у апошні час, да звычайных тытунёвых вырабаў.

■ Парламенцкі дзённік

# Новая старонка ў супрацоўніцтве

**Віцэ-маршал сейма Рэспублікі Польшча Рышард ЦЯРЛЕЦКІ наведаў нашу краіну. За апошнія гады гэта першы візіт на такім высокім узроўні.**

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** на сустрэчы з польскім палітыкам адзначыў, што гэты візіт адкрывае новую старонку ў двухбаковым супрацоўніцтве.

Адным з «флагманаў» беларуска-польскіх адносін з'яўляецца навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва. Цяпер сумесна рэалізуюцца 103 праекты. З іх 22 — у галіне аграрнай навукі, а 17 — гуманітарныя. Асабліва спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыў працу фізікаў і матэматыкаў. Іншым перспектыўным кірункам з'яўляецца пашырэнне эканамічных адносін.

— Летась адбыўся пэўны спад у эканамічным супрацоўніцтве — заўважыў Міхаіл Мясніковіч. — Для гэтага ёсць і аб'ектыўныя прычыны. Але мы зацікаўлены ў тым, каб польска-беларускіх праектаў было больш. З улікам таго, што мы займаем дастаткова актыўную пазіцыю ў Еўразійскім эканамічным саюзе, думаю, польскаму бізнесу сумесныя праекты будуць вельмі выгадныя. Супрацоўнічаючы з Беларуссю, можна працаваць з усімі 160 мільёнамі спажыўцоў Адзінай эканамічнай прасторы.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** падчас размовы з Рышардам Цярлецкім выказаў меркаванне, што падобныя сустрэчы даваляюць зблізіць пазіцыі дзвюх краін па асобных пытаннях і выпрацаваць шляхі развіцця адносін — у тым ліку міжпарламенцкіх — на бліжэйшую перспектыву.

— Беларусь і Польшча — суседзі, і мы блізкія не толькі ў геаграфічным плане, — заявіў Уладзімір Андрэйчанка. — Беларускія парламентарыі гатовы да дыялогу, да канструктыўнага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

**Надзея АНІСОВІЧ, Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Выбары-2016

# КАМПАНІЯ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ БОЛЬШ ГАРАЧАЙ

## Конкурс у Палату прадстаўнікоў — амаль 6 чалавек на месца

**З'явілася дакладная лічба, колькі ж вылучылася кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — на 110 дэпутацкіх мандатаў прэтэндуюць 630 чалавек. Адпаведная інфармацыя размешчана на сайце Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Хутчэй за ўсё, не кожны ў выніку будзе зарэгістраваны, тым не менш конкурс у вышэйшы орган заканадаўчай улады маленькім не назавеш.**

### Кур'ёз у акруговай камісіі

— Калі меркаваць па тых пытаннях, з якімі да нас звяртаюцца акруговыя камісіі з мэтай кансультацыі, то, безумоўна, мы разумеем, што зарэгіструюць не ўсіх, — сказала ў размове з журналістамі **Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.** — Гэта сведчыць пра тое, што ёсць брак і ў зборы подпісаў... Дарэчы, расказалі адну вельмі кур'ёзную гісторыю. Адзін патэнцыйны кандыдат так «чысціў» свае падпісныя лісты, выключаючы, на яго думку, дэфектныя подпісы, што пасля ў пераліку іх аказалася не тысяча, а 999. Цяпер не хапае аднаго подпісу. Мы сказалі камісіі, каб там вельмі ўважліва пераличылі гэтыя подпісы — раптам, сапраўды, адзін гэты подпіс дзе-небудзь знойдзецца.

Адказваючы на пытанне журналіста, якой павінна быць ідэальная агітацыя, Лідзія Ярмошына выказала меркаванне, што агітацыя можа быць любой, галоўнае, каб яна не перашкаджала іншым кандыдатам і не абражала іх.

### Новы член Назіральнага савета пры ЦВК

Яшчэ адно пытанне, якое абмяркоўвалася на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі, тычылася змянення складу створанага пры ЦВК Назіральнага савета па кантролі за захаваннем парадку і правілаў правядзення передвыбарнай агітацыі ў СМІ. Старшыня Цэнтральнай камісіі Лідзія Ярмошына паведаміла, што ў ЦВК паступіў зварот ад **старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэя БАСТУНЦА** з просьбай уключыць яго самога і яго намесніка ў склад назіральнага савета. Старшыня Цэнтральнай камісіі звярнула ўвагу на тое, што ў склад назіральнага савета ўключаецца не больш за аднаго чалавека ад адной арганізацыі, і прапанавала задаволіць просьбу БАЖ часткова. Члены Цэнтрвыбаркама падтрымалі яе прапанову, і старшыня БАЖ увайшоў у склад назіральнага савета.

### Бясплатная публікацыя — толькі адна

Што да парадку выкарыстання кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, то, як падкрэсліла **член Цэнтральнай камісіі Алена ДМУХАЙЛА**, кожны кандыдат мае права толькі адзін раз бясплатна размясціць сваё выступленне ў газеце. Як заўважыла Алена Дмухайла, для таго, каб не ўзнікла накладак, рэдакцыя кожнага СМІ, куды паступіла праграма кандыдата, павінна адразу ж паведаміць пра гэта ў Цэнтральную камісію. Яе супрацоўнікі размесцяць адпаведную інфармацыю на сайце.

— Гэта робіцца для таго, каб кожная рэдакцыя, калі атрымлівае праграму кандыдата, магла зайсці на сайт ЦВК і паглядзець, ці не паступала гэта праграма раней у нейкія іншыя газеты, — патлумачыла Алена Дмухайла. — Адпаведна, калі раней кандыдат ужо выкарыстаў сваё права на бясплатнае апублікаванне, яму будзе адмоўлена ў паўторнай публікацыі.

На яе думку, раздзел з апублікаваннем перадвыбарных праграм таксама будзе цікавы назіральнікам і выбаршчыкам.

Выступленні па тэлебачанні і радыё пачнуцца з 15 жніўня і працягнуцца да 2 верасня. Выступленні па тэлебачанні будуць трансліравацца з 19 да 20 гадзін, па радыё — з 7 да 8 гадзін.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Рэгіён

# ШЛЯХ, АКРЭСЛЕНЫ ЖЫЦЦЁМ

## «Перспектива» на хвалі часу



Рэдакцыйны калектыў газеты «Перспектива».

**У творчай «скарбонцы» Гродзенскай рэгіянальнай газеты «Перспектива» ўжо тры «Залатыя Літары» Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі. Першай былі адзначаны публікацыі на гістарычныя тэмы, другой — ілюстрацыі і фатаграфіі, а сёлета — матэрыялы сацыяльнай тэматыкі. Акрамя таго, газета стала лаўрэатам у намінацыі «Лепшы інтэрнэт-праект».**

— У такім раёне як Гродзенскі газета не павінна быць дрэннай, — лічыць **галоўны рэдактар газеты «Перспектива» Тамара РУДАК.**

***— Гродзенскі раён вядомы ў краіне, ды і за яе межамі, як адзін з перадавых у аграрнай вытворчасці. І, як відаць, ніводны нумар газеты не абыходзіцца без матэрыялаў па гэтай тэматыцы. А якія прыярытэты бачыце для сябе ў сацыяльнай сферы?***

— Тыя, якія будуць адпавядаць інтарэсам людзей. У нашым выпадку — жыхарам Гродзенскага раёна. Пры гэтым мы надаём вялізную ўвагу дасягненням, але адначасова ўзнімаем і існуючыя праблемы. Пішам, што робіцца для людзей, якія адкрываюцца аб'екты, будуюцца дарогі ...

Нядаўна, напрыклад, у аграгарадку Путрышкі вельмі важнай падзеяй адзначылі Год культуры. Адрэстаўраваны (затрачана 20 мільярдаў недэнамінаваных рублёў) і цяпер бліскучым пераживае другую маладосць будынак Цэнтра культуры, якому ўжо 58 гадоў. А пакольку гэта вельмі важна для мясцовых жыхароў, то важна і для раённай газеты. Мы паехалі ў Путрышкі, пагутарылі з людзьмі і падрыхтавалі фотарэпартаж. Такім чынам стараемся адлюстраваць кожную значную падзею, кожны нюанс у жыцці раёна. Па серадах дзве паласы газетнага нумара адводзім пад рубрыку «Падзеі. Факты», дзе падаём навіны самай рознай тэматыкі — і станоўчыя, і праблемныя.

***— Якія праблемы ўзнімаеце?***

— Літаральна ў апошнім нумары мы надрукавалі артыкул «Школьны шопінг». Пабывалі ў адным з аграгарадкоў і пацікавіліся, што сёння гандаль прапануе сельскім дзеткам. Убачылі, што з канцылярскімі таварамі асаблівых праблем няма, чаго не скажаш пра касцюмы і іншае адзенне — трохі засталося з мінулага года. Спартыўнага абутку ўвогуле не аказалася. Гэтая публікацыя стала падставай для абмеркавання на планёрцы ў старшыні райвыканкама.

Да гонару кіраўніцтва райвыканкама і, пэўна, нашага выдання, практычна ніводны газетны нумар не выходзіць без нейкіх крытычных публікацый. Зразумела, усё павінна быць аргументавана. Як правіла, па той ці іншай тэме мы бяром каментарый у некалькіх спецыялістаў. І калі факты дакладныя, то рэакцыя ўлады на артыкул не прымушае сябе чакаць.

Па сутнасці, улада і газета ў вырашэнні многіх сацыяльных пытанняў працуюць у адным кірунку. Напрыклад, доўгі час была праблема з добраўпарадкаваннем вуліцы Школьнай у Адэльску. Мясцовыя жыхары паскардзіліся старшыні райвыканкама, умяшалася і газета. І пачалі наводзіць парадак. Зараз ужо са станоўчай пазіцыі мы расказваем, што зроблена.

***— Адзін з апошніх праектаў газеты — укладыш «Вячэрні Скідзель». Гэта звязана з яго новым статусам як горада-спадарожніка абласнога цэнтра?***

— У Гродзенскім раёне афіцыйна няма райцэнтра і фактычна ім з'яўляецца горад Скідзель — самы вялікі населены пункт, дзе пражывае 10,5 тысячы жыхароў. За апошнія гады раённай уладай шмат зроблена, каб надаць яму прыстойны выгляд. А мы, са свайго боку, вырашылі вярнуць гораду газету, якая ў яго, дарэчы, калісьці была. Так і з'явілася ідэя «Вячэрняга Скідзеля», дзе пішам аб горадзе і яго жыхарах, перспектывах развіцця як спадарожніка абласнога цэнтра. Нават размясцілі там свой карпункт, куды людзі могуць прынесці аб'явы, віншаванні, паведаміць нейкую інфармацыю, якая можа стаць падставай для газетнай публікацыі.

***— Як газета пазіцыянуе сябе ў інтэрнэце?***

— Нашы спецыялісты стварылі, мяркую, някепскі сайт са многімі рубрыкамі, які ў суткі праглядае каля 1 тысячы чалавек. Пры гэтым матэрыялы, якія там змешчаны, часта служаць падставай для цытавання іншымі СМІ. Да таго ж газета прадстаўлена ў шэрагу сацыяльных сетак — там мы маем сваіх чытачоў. Відаць, што ёсць такія пляцоўкі для палемікі, водгукаў на публікацыі. Хачу толькі пажадаць, каб каментарыі былі карэктнымі, а іх аўтары не апускаліся, як бывае, да хамства.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

■ Актуальна

# Яшчэ больш нафты

## А імпарт будаўнічай мінеральнай сыравіны зменшыцца ўдвая



— За апошнюю пяцігодку забяспечаны прырост запасаў нафты, калійнай солі, цэментнай сыравіны, шкляных пяскоў, даламіту, будаўнічага пяску, пясчана-гравійных сумесяў, — паведаміў **кіраўнік упраўлення па геалогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Сяргей МАМЧЫК.** — У Брэсцкай упадзіне выяўлены радовішчы базальтаў і сапанітавых туфаў — перспектыўнай сыравіны для вытворчасці мінеральных валокнаў і іншых відаў прадукцыі, якая завозіцца ў рэспубліку.

Згодна з рашэннем Усебеларускага народнага сходу, у наступную пяцігодку інтэнсіфікацыя выкарыстання мінеральна-сыравіннай базы выбрана адным з галоўных напрамкаў развіцця эканомікі краіны. Прэм'ер-міністр Беларусі зацвердзіў план дзеянняў па інтэнсіфікацыі засваення мінеральна-сыравіннай базы на гэты перыяд. Прынята Дзяржаўная праграма аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў на 2016—2020 гады.

Адным з перспектыўных напрамкаў развіцця паліўна-энергетычнага комплексу лічыцца нафтаздабыча і перапрацоўка. Для большай прадукцыйнасці здабычы гэтага карыснага выкапня будзе ўкараняцца новая тэхніка. Плануецца праводзіць пошукава-ацэначныя работы і засвойваць ужо разведаныя радовішчы, якія дагэтуль не распрацоўваюцца. На разведку і распрацоўку радовішчаў мяркуецца прыцягваць інвестыцыі. Спецыялісты плануюць давесці здабычу нафты да 1,8 млн тон у год (сёння гэты паказчык складае 1,6 млн тон у год).

Акрамя таго, будуць павялічаны аб'ёмы выкарыстання тарфянога паліва на 10% (у параўнанні з леташнімі паказчыкамі), што дазволіць замясціць імпарт прыроднага газу на суму 80 млн долараў ЗША. Дарэчы, ўвесь здабыты ў Беларусі газ цалкам перапрацоўваецца, аб'ёмы невялікія — 220—230 млн кубічных метраў. З уводзеннем у эксплуатацыю Астравецкай атамнай электрастанцыі мяркуецца знізіць выкарыстанне газу, які імпартуецца з Расійскай Федэрацыі.

Дынамічна развіваецца вытворчасць калійных угнаенняў. На базе Петрыкаўскага радовішча будзе ўведзены ў эксплуатацыю горна-ўзбагачальны комплекс магутнасцю здабычы не менш за 1,5 млн тон хларыду калію ў год.

Спецыялісты таксама збіраюцца павялічыць глыбіню перапрацоўкі сапрапелю на радовішчах, якія распрацоўваюцца. Гэта дазволіць атрымліваць угнаенне, харчовыя дабаўкі і раслінныя грунты на аснове сапрапелю.

Беларусь амаль цалкам забяспечана будаўнічымі матэрыяламі на аснове ўласнай мінеральнай сыравіны.

— Праводзяцца работы па разведцы пяскоў, пясчана-калійных сумесяў, цэментнай сыравіны, — адзначыў Сяргей Мамчык. — Летась уведзена ў эксплуатацыю каля 35 новых участкаў і радовішчаў пяску і пясчана-гравійнай сумесі. У краіну завозіцца некаторая колькасць гравію, шчэбню, кварцавага пяску. У найбліжэйшы час плануецца павялічыць магутнасць перапрацоўкі шчэбню да 25 млн тон у год, дзякуючы чаму імпарт сыравіны прыпыніцца. Плануем знізіць да мінімуму ўвоз кварцавага пяску. У цэлым разлічваем удвая зменшыць імпарт індустрыяльна-будаўнічай мінеральнай сыравіны.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

■

# АЛІМПІЙЦЫ ГАТОВЫЯ!

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У Рыа цырымонія праводзілася па вызначаным пратаколе і доўжылася каля 30 хвілін. **Шэф нашай місіі Аляксандр ГАГІЕЎ** уручыў падарунак мэру алімпійскай вёскі чэмпіёнцы свету ў складзе зборнай Бразіліі па баскетболе Жанэт душ Сантуш Аркаін *(на фота)*. Падарунак ад усёй беларускай алімпійскай каманды — набор значкоў з піктаграмамі тых відаў спорту, у якіх нашы спартсмены заваявалі ліцэнзіі.

У адказ мэр перадала камандзе памятны лагатып Гульняў-2016, які ў будучыні папоўніць музейную экспазіцыю НАК Беларусі.

У цырымоніі ў складзе нашай дэлегацыі прынялі ўдзел прадстаўнікі каманд па баскетболе, настольным тэнісе, акадэмічным веславанні і боксе.

Нагадаем, у складзе беларускай каманды на Алімпіядзе-2016 выступяць 124 атлеты, якія будуць змагацца за ўзнагароды ў 24 відах спорту.

Усяго ў Алімпійскіх гульнях у Рыа возьме ўдзел больш за 10,5 тыс. спартсменаў з 207 краін свету, што з'яўляецца рэкордным за ўвесь час правядзення Алімпіяд. Атлеты разыграюць 306 камплектаў узнагарод (таксама рэкорд) у 28 відах спаборніцкай праграмы.

Урачыстае адкрыццё Алімпійскіх гульняў адбудзецца 5 жніўня на стадыёне «Маракана». Закрыюцца Гульні 21 жніўня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*



■ Каб помнілі



**Учора ў Мінску на востраве Мужнасці і Смутку прайшоў мітынг, прысвечаны 20-й гадавіне з дня адкрыцця мемарыяльнага комплексу «Помнік воінам-інтэрнацыяналістам».**



Фота БЕЛТА.

# Званкі па суботах

**У краіне працягваюцца прамыя тэлефонныя лініі. Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць іх у суботу, 6 жніўня, з 9.00 да 12.00.**

Кожную суботу на працягу трох гадзін прадстаўнікі ўлады адказваюць на самыя хвалюючыя пытанні жыхароў Беларусі. Эканамічнае развіццё гарадоў, своечасовая выплата заработнай платы, праблемы ў сферы ЖКГ і многія іншыя пытанні ў гэты час становяцца ключавымі. Як правіла, у кожным з рэгіёнаў адказваюць не менш як на чатыры дзясяткі званкоў.

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БУБЕНЧЫК Алена Аляксандраўна (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні КАРПЕНКА Ігар Васілевіч (80172224444).

■ Класныя навіны

# «Нам мір завешчана берагчы»...

**Гэту тэму Міністэрства адукацыі парэкамендавала для правядзення першых урокаў, якія пройдуць у Дзень ведаў ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі.**

Як падкрэсліваецца ў інструктыўна-метадычным лісце галоўнага адукацыйнага ведамства, урок павінен быць скіраваны на пашырэнне ведаў навучэнцаў аб міры як абсалютнай каштоўнасці, на фарміраванне вобраза міру як ладу жыцця на Зямлі, садзейнічаць выхаванню ў навучэнцаў пачуцця гонару за міралюбівую палітыку нашай дзяржавы: «Надзвычай важна растлумачыць дзецям, што сапраўдны патрыёт не можа хацець, каб яго Радзіма ўдзельнічала ў любых узброеных канфліктах. Ніякія стратэгічныя інтарэсы не могуць апраўдаць гібель і пакуты людзей. Патрыёт можа ўзяць зброю толькі ў адным выпадку: калі на яго Радзіму здзейснены ўзброены напад».

Пры падрыхтоўцы да першага ўрока рэкамендавана выкарыстанне такіх формаў работы, як брэйн-рынг, філасофскі стол, дзелавая гульня, прэзентацыя праектаў і іншыя. Таксама актуальнымі для школьнікаў будуць гутаркі на тэму «Мір і вайна вачыма дзяцей», віктарыны «Ці ведаеш ты герояў Вялікай Айчыннай вайны?», наведванне музеяў і мемарыяльных комплексаў, завочныя падарожжы «Перагортваючы старонкі гісторыі», конкурсы чытальнікаў, малюнкаў і плакатаў.

Мерапрыемствы Дня ведаў павінны стаць новым імпульсам для развіцця валанцёрскага руху навучэнцаў і бацькоўскай грамадскасці, правядзення дабрачынных і працоўных акцый, скіраваных на дапамогу сем'ям, якія пацярпелі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Завяршыць мерапрыемствы, прысвечаныя Дню ведаў, рэкамендуецца на яркай эмацыянальнай ноце — урачыстым ускладаннем вянкоў і кветак да помнікаў, абеліскаў і месцаў пахавання загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Ну і ну!

# Украла тэлефон у... сужэнца сяброўкі

**Маладая сям'я святкавала першы дзень нараджэння свайго дзіцяці. Запрасілі родных і сяброў. А скончылася мерапрыемства крадзяжом дарагога мабільнага тэлефона...**

— Гаспадар кватэры прылёг адпачыць, паклаўшы яго побач з сабой. 22-гадовая госця, калі сыходзіла, вырашыла зрабіць гэта не з пустымі рукамі і прыхапіла тэлефон, — паведаміла **прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга КУЦЬКО**. — Наступным днём дзяўчына здала яго ў ламбард за 100 дэнамінаваных рублёў. Грошы зламысніца пусціла на асабістыя патрэбы. Прапажу тэлефона, які быў набыты ў крэдыт, уладальнік заўважыў толькі ранкам і адразу ж звярнуўся ў міліцыю. Сума ўрону склала 480 рублёў «новымі». Праваахоўнікі ўстанавілі месцазнаходжанне зладзюжкі. Зламысніцай — сяброўкай гаспадыні дома — была маладая мама, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці. Яна адразу ж прызнала віну. Заведзена крымінальная справа за крадзеж. Мабільны тэлефон супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі з ламбарда і вярнулі законнаму ўладальніку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# АНЛАЙН-СТАСУНКІ З... ВАГОНА

**У цягніках Беларускай чыгункі з'явіцца бясплатны інтэрнэт. Кампанія Velcom забяспечыць доступ у яго па тэхналогіі Wi-Fi у двух новых цягніках міжрэгіянальных ліній бізнес-класа, якія будуць курсіраваць па маршруце Мінск—Гомель.**

Бясплатным інтэрнэтам пасажыры змогуць карыстацца на працягу ўсяго шляху ад Мінска да Гомеля пры любой хуткасці руху цягніка.

Як расказалі ў прэс-службе магістралі, Velcom і Беларуская чыгунка выкарыстоўвалі лепшы сусветны вопыт пабудовы бесправадных сетак на рухомым саставе.

Ва ўсіх вагонах устаноўлены кропкі доступу Wi-Fi, якія сыходзяцца ў адзіны маршрутызатар з SIM-картай. Цягнік падключаецца да інтэрнэту праз 3G-сетку ад Velcom, а трафік «раздае пасажырам» з дапамогай тэхналогіі Wi-Fi.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Рэпартаж

# Падарунак да чыгуначнага «Новага года»



**Гудок пры адпраўленні цягнік цяпер не дае, аднак урачыстасць важнага для Беларускай чыгункі і яе пасажыраў моманту гэта ніколькі не сапсавала: напярэдадні прафесійнага свята чыгуначнікаў па маршруце Гомель—Мінск—Гомель пачаліся перавозкі новага фармату.**



Фота БЕЛТА.

Пачалося ўсё пяць гадоў таму з адкрыцця гарадскіх ліній. Цяпер да Мінска з камфортам можна дабрацца з трох гарадоў-спадарожнікаў: Заслаўя, Рудзенска і Смалявіч, у хуткім часе абяцаюць дадаць у гэты спіс і Дзяржынск. Імкненне да пашырэння сеткі гарадскіх ліній лёгка растлумачыць: усяго за пяць гадоў іх паслугамі скарысталіся каля 12 мільёнаў чалавек. Актыўна развіваюцца рэгіянальныя перавозкі бізнес-класа, затрабаванасць якіх таксама знаходзіцца на высокім узроўні.

Для арганізацыі міжрэгіянальных зносін новага фармату напрамак Гомель—Мінск быў выбраны нездарма: сярод перавозак унутры краіны менавіта на яго прыходзіцца адна з найбольш значных нагрузак. Рэалізацыя праекта стала магчымай пасля завяршэння электрыфікацыі ўчастка Гомель—Жлобін—Асіповічы.

Асноўная задача падчас арганізацыі міжрэгіянальных перавозак бізнес-класа была ў істотным скарачэнні часу ў дарозе. Як адзначыў **начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір МАРОЗАЎ,** адлегласць паміж сталіцай і абласнымі цэнтрамі павінна пераадольвацца за тры гадзіны. Гэта правіла не датычыцца толькі Гродна: адмысловая траса чыгункі не дазваляе пакуль скараціць час у дарозе менш чым да трох з паловай гадзін.

Да гэтага час у дарозе з Гомеля да сталіцы займаў ад чатырох да васьмі з паловай гадзін. Для дасягнення неабходнага выніку цягнік развівае максімальную допушчальную хуткасць і ідзе з мінімальнай колькасцю прыпынкаў. Трапіць на першы цягнік аказалася не так проста: усе 382 білеты былі раскуплены загадзя. На думку разгубленых ад такой увагі да сваёй паездкі пасажыраў, спрыялі ажыятажу прымальныя цэны. Звычайны «сядзячы» білет каштуе 8 рублёў 39 капеек, ахвотным пракаціцца ў бізнес-класе давядзецца аддаць 11 рублёў 62 капейкі. Параўнайце, квіток у плацкарце па тым жа маршруце, але іншым цягніком абыдзецца каля 7 рублёў. Аднак, як запэўніў Уладзімір Марозаў, менавіта міжрэгіянальныя лініі бізнес-класа забяспечваюць аптымальныя суадносіны цана—якасць.

Па прызнанні начальніка Беларускай чыгункі, прафесійнае свята ў арганізацыі ўспрымаецца як другі Новы год: перад ім таксама падводзяцца вынікі і прымаюцца планы на будучыню. «Мы ўсё імкнёмся павялічыць хуткасць перамяшчэння, але ж яшчэ зусім трохі і нельга будзе разглядзець за акном цягніка цудоўныя абшары нашай Радзімы», — з сумам пажартаваў Уладзімір Марозаў, таму і ў віншаваннях прагучала думка аб тым, што трэба вучыцца жыць без пастаяннай спешкі і, дзякуючы гэтаму, усоды паспяваць. Сярод найбольш глабальных планаў Беларускай чыгункі — яе пашырэнне, а таксама запуск міжнароднай лініі ў напрамку Вільнюса. Павышэнні тарыфаў прадбачацца, але нязначныя.

У цягніку, распрацаваным «Штадлер Мінск» па замове БЧ спецыяльна для эксплуатацыі ў Беларусі, забяспечаны ўсе ўмовы для праезду пасажыраў з абмежаванымі магчымасцямі, значна больш зручна стане падарожнічаць з маленькімі дзецьмі. **Начальнік пасажырскай службы Аляксандр ЗАХАРЭВІЧ** падкрэсліў, што новы фармат перавозак заснаваны на трох правілах: экалагічнасць, камфорт, хуткасць. «У цягніку з 7 вагонаў 5 санвузлоў, у тым ліку і для пасажыраў з абмежаванымі магчымасцямі, у сярэдзіне цягніка ёсць бар, таксама прадугледжаны мабільны (развазны) гандаль, ёсць разеткі, Wi-Fi. Але якасць абслугоўвання яшчэ трэба павышаць. Павінна быць так: пасажыр толькі зайшоў, а мы ўжо стаім каля яго, каб выканаць усе просьбы. Для гэтага неабходна большая колькасць персаналу», — разважае Аляксандр Захарэвіч.

Аднак і прадастаўленай якасці паслуг першыя пасажыры былі прыемна здзіўлены. «Так хутка! Вельмі камфортна! Чыста і прыгожа! Wi-Fi — гэта тое, што трэба!» — дзяліліся яны станоўчымі ўражаннямі. Цягнік будзе штодзённым, з Гомеля ў Мінск, калі пашчасціць набыць квіткі, можна адправіцца а сёмай гадзіне раніцы, а ў зваротным напрамку ўвечары ў 18.50.

**Дар'я КАСКО**

■ Будзь у курсе!

## НЕХАРЧОВЫЯ ТАВАРЫ — СА ЗНІЖКАМІ

**Акцыі «Дні зніжак» пройдуць у жніўні ў гандлёвых арганізацыях Мінска, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама. Гэтым разам яны распаўсюджваюцца на нехарчовыя тавары.**

Так, зніжкі ў ЦУМе «Мінск» 13 і 27 жніўня складуць 17 працэнтаў. Універмаг «Беларусь» 9, 16, 17, 23, 24 жніўня прапануе набыць нехарчовыя тавары па цане, меншай на 20 працэнтаў, а таксама 27 і 28 жніўня прадастаўляе зніжку ў памеры 20 працэнтаў на тавары для школьнікаў. У ГУМе можна будзе сэканоміць 20 працэнтаў ад сумы пакупкі 11 і 25 жніўня, а 27 жніўня — 17 працэнтаў. Зніжкі ў Гандлёвым доме «На Нямізе» ў памеры 20 працэнтаў парадуюць пакупнікоў 10, 17, 24, 27, 28 жніўня. «Кірмаш» прапануе прыемны бонус у памеры 15 працэнтаў ад цэн на тавары 10, 17, 24, 27, 31 жніўня. У «Старце-Х» можна будзе сэканоміць 15 працэнтаў ад цэн на нехарчовыя тавары 11, 17, 25 жніўня. У «Паўночніцы» памер зніжак 11, 24 жніўня складзе 15 працэнтаў (на асобныя групы прамысловых тавараў). «1000 дробязяў» з эканоміяй для кашалька можна будзе наведаць 11, 18, 25 жніўня — цэны ў гэтыя дні будуць меншымі на 15 працэнтаў. Крамы «Сталіцы» 13 і 27 жніўня прапануюць зніжкі ад 5 да 50 працэнтаў. Як удакладнілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, 27 і 28 жніўня ў Мінску абвешчаны адзіны дзень зніжак — пакупнікі змогуць сэканоміць не менш за 15-20 працэнтаў на пакупках за кошт узгодненага зніжэння цэн арганізацыямі-вытворцамі і гандлёвых надбавак — гандлёвымі арганізацыямі.

## БІЛЕТ НА ЦЯГНІК У ЕЎРОПУ — ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**Беларуская чыгунка пачала продаж білетаў у краіны Еўропы праз інтэрнэт, паведамілі ў прэс-службе магістралі. Зроблена гэта для павышэння якасці абслугоўвання пасажыраў і развіцця электронных продажаў праязных дакументаў у міжнародных зносінах.**

Зараз купіць білет анлайн можна ў такія краіны, як Польшча, Германія, Балгарыя, Францыя, Чэхія, Венгрыя. Афармленне электронных праязных дакументаў на першым этапе ўкаранення новай тэхналогіі адбываецца без электроннай рэгістрацыі. Для здзяйснення паездкі праязныя дакументы, аплачаныя праз інтэрнэт, неабходна ў абавязковым парадку аформіць у спецыялізаваных пунктах афармлення праезду ў міжнародных зносінах Беларускай чыгункі. Таксама магчыма вяртанне на сайце электронных праязных дакументаў, аплачаных з дапамогай банкаўскіх карт праз сістэму плацяжоў ASSIST і «Інтэрнэт-банкінг» Беларусбанка. Вяртанне ў касах адбываецца ў спецыялізаваных пунктах продажу. У найбліжэйшай перспектыве Беларуская чыгунка плануе паэтапнае ўкараненне электроннай рэгістрацыі пасажыраў на цягнікі міжнародных ліній, уключаючы і бесперасадачныя вагоны, што курсіруюць з імі, у зносінах з краінамі Еўропы, а гэта дазволіць выключыць абавязковае афармленне праязных дакументаў у касах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# КЛУБ НА КОЛАХ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І сапраўды канцэрты аўтаклуба нагадваюць былыя пасядзелкі на прызбах. Вядома ж, у добрае надвор'е — усе выступленні на вуліцах, а ў непагадзь гледачы забіраюцца ў аўтобус, яго салон выступае адначасова і як сцэна для артыстаў, і як глядзельная зала. З аўтаклубам звычайна едзе невялікі калектыў, але гэтага хапае для 40 хвілін канцэрта.

— Аўтаклуб разлічаны на абслугоўванне вёсак, дзе няма стацыянарных устаноў культуры, — расказвае **загадчыца мабільнай установы культуры Бярозаўскага раёна Людміла КІСЕЛЬ.** — У нас такіх 80, у 20 пражывае ад аднаго да дваццаці чалавек. У маланаселеных вёсках бываем пастаянна. Раз у год дык дакладна ўсіх наведваем. Адзінокіх людзей хоць нечым парадуем, словам добрым, песняй. Вой, як нас чакаюць!





Людміла Васілеўна ў галіне культуры адпрацавала ўжо каля 40 гадоў, на пенсію збіралася, а тут прапанавалі заняцца аўтаклубам. І хоць спачатку падавалася гэта вельмі складанай работай, жанчына хутка асвоілася. Ужо знойдзены розныя формы работы, і аўтобус ПАЗ ніколі не прастойвае. У сярэднім за месяц работнікі клуба на колах праводзяць каля дваццаці розных мерапрыемстваў. Аўтаклуб укамплектаваны самай сучаснай гукаўзмацняльнай апаратурай. Таму ён можа ладзіць як выступленні з гармонікам, так і вялікія праграмы з фанаграмай.

Аўтаклуб дае магчымасць самым розным калектывам і пра сябе заявіць, і з жыхарамі глыбінкі пазнаёміцца. Кожны раз з ім калясяць новыя артысты, прычым у такія паездкі выбіраюцца і дзеці. Так, упершыню ў раёне былі арганізаваны каталіцкія Калядкі. Школьнікаў, што ўдзельнічалі ў касцюміраваным свяце, бабулі абдымалі, цалавалі, дзякавалі, што хоць на нейкі час іх вёска ажыла, у яе вярнулася традыцыя.

Каб людзям было зручна, аўтаклуб часта падстройваецца пад работу бібліобусаў, што вязуць людзям кніжкі (а на вёсках не так ужо мала народу любіць пачытаць). Людміла Васілеўна добра ведае графік аўталавак. Калі магазіны ў малых вёсках пазачыняліся, яны для месцічаў — свята. Збяруцца жыхары каля аўталавак, а тут і артысты пад'спелі.

Часам людзі бянтэжацца, што да іх столькі ўвагі, асабліва калі канцэрт даецца ўсяго для 4-5 слухачоў. Але хутка ўсе асвойваюцца, часам і прыпеўкі праспяваць просяць, бабулькі і ў скокі могуць пайсці, не супраць вяскоўцы і самі паспяваць ці расказаць штонебудзь карыснае.

Ладзіць аўтаклуб і фальклорныя экспедыцыі. У час такіх падарожжаў спецыялісты запісваюць рэдкія беларускія словы, цікавыя песні, сакрэты, звязаныя з рамёствам, абрадамі. Вясковыя жанчыны перадалі інструменты, звязаныя з валяннем, расказалі пра старыя тэхналогіі, падарылі экспанаты для музея, маўляў, «нас не будзе, то прападзэ».

— У нас багата цудоўных людзей. Мы ездзілі віншаваць з 95-годдзем жанчыну (адна з місій аўтаклуба не пакідаць без увагі юбіляраў). Дык у яе столькі запісалі замоў і казак, ды ўсё гэта на дыялекце. У нашым раёне вельмі цікавая гаворка. Пра нашыя спораўскія жарты многа хто ўжо ведае, але ёсць у нас і спораўскі слоўнік...

«Калі вы не можаце прыехаць да нас, мы паедзем да вас», — вырашылі ў Бярозаўскім раёне і запусцілі праграму «Бюро радасці». Цяпер ніхто са старажылаў не застанецца без увагі, бо іх наведваюць дома. Ларыса Васілеўна расказвае, што многіх жыхароў ужо добра ведае, тэлефануе ім.



Калі ў вёсцы ёсць нямоглыя людзі, якім і некалькі крокаў зрабіць праблема, артысты выступаюць у іх двары, туды ж і астатнія вяскоўцы падцягваюцца. Цяжка нават уявіць, якое гэта свята для такіх людзей.

Пачаў аўтаклуб ладзіць падарожжы і на хутары.

— Неяк з сынам блукалі па лесе, бачу сцежку і цікаўлюся, ці не прывядзе яна да каго-небудзь, — расказвае загадчыца аўтаклуба. — Сапраўды прыйшлі да маленькага дамка, у двары курачкі ходзяць. І тут бабулька жыве адна-адзінюткая. Маленькая, далікатная, ёй больш за 90 гадоў. Па яе словах, яна тут з дзяцінства, ніколі нікуды не з'язджала. Вось я і падумала, як мне яе парадаваць. Пазней заехалі сюды з аўтаклубам на Каляды.

Людміла Васільеўна паказвае здымкі — завязалася такая традыцыя фіксаваць гісторыю аўтаклуба: «Гэта мы да аднаго з хутароў дабіраліся. Зіма была, аўтобус далей ехаць не мог, і мы ішлі пешшу...»

Сапраўды, да многіх хутароў не так ужо проста дабрацца, часам даводзіцца камандзе аўтаклуба намотваць пешшу не адзін кіламетр, прабірацца праз падталыя палі і глухія лясныя сцежкі.

З аўтаклубам падарожнічаюць не толькі артысты, але і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, старшыні сельсаветаў. Вядома ж, сумесная праца дапамагае зрабіць такія сустрэчы яшчэ і карыснымі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
4 ЖНІЎНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15798)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

## Re1ikt:

# «Ідэй хапае на два альбомы»

**На іх канцэрты прыходзяць абсалютна розныя слухачы — і брутальныя металісты, і рамантычныя дзяўчаты, і патрабавальныя музычныя снобы. Падчас прэзентацыі новага альбома «Лекавыя травы» гурт з лёгкасцю сабраў аншлаг у адным з найбуйнейшых клубаў сталіцы. Яны выступаюць на прэстыжных еўрапейскіх пляцоўках, але не грэбуюць невялікімі беларускім гарадамі, дзе часам прадстаўляюць больш лёгкую, акустычную версію гучання каманды.**

**Ды і ў цэлым сёння складана ўявіць беларускую рок-сцэну без гурта Re1ikt! Колькі гадоў таму хлопцы літаральна ўварваліся ў свет айчыннай музыкі і, думаецца, надоўга застануцца ў топе. Пра тое, чым сёння жыве адзін з самых запатрабаваных айчынных рок-гуртоў, якія сюрпрызы рыхтуе для слухачоў і чаму так важна камунікацыю з публікай не абмяжоўваць толькі канцэртамі — наша гутарка з лідарам і барабаншчыкам Re1ikt Аляксандрам ДЗЕМІДЗЕНКАМ і гітарыстам гурта Віталём МАКШУНОМ.**

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



*Адпачыць і зарабіць*

# ЗАПІСАЦЦА Ў «КАРАЛІ ДАРОГ»,

## або Тэорыя, падмацаваная практыкай

**З усіх кірункаў працы студэнцкіх атрадаў самым традыцыйным і папулярным з'яўляецца будаўнічы. Байкала-Амурская магістраль, Саяна-Шушанская ГЭС — гэтыя і многія іншыя аб'екты ў савецкія часы сталі знакавымі для студатрадаўскага руху. Як раней, так і цяпер, лідарам у стварэнні будатрадаў у нашай краіне з'яўляецца Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» пабывалі на галоўных аб'ектах, якія ўзводзяцца намаганнямі студэнтаў гэтай ВНУ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**У беларуска-кітайскім індустрыяльнымі парку студэнты БНТУ займаюцца вязкай арматуры і залівкай бетону.**

— Сёлета ў нашым універсітэце было сфарміравана 134 атрады, у склад якіх увайшло больш як дзве тысячы чалавек, — расказвае **начальнік штаба працоўных спраў БРСМ БНТУ Юрый РАМАНЧЫК.** — Думаю, пры агульнай колькасці студэнтаў у 15 тысяч — гэта неблагі паказчык. Мы традыцыйна сфарміравалі вялікую колькасць будаўнічых атрадаў, але былі і новаўвядзенні. Сэрвісныя атрады працавалі падчас прыёмнай кампаніі ў нашым універсітэце і ў адной з буйных гандлёвых сетак, а педагагічныя (у БНТУ ёсць профільны інжынерна-педагагічны факультэт) — у дзіцячых лагерах важатымі і сервіснымі рабочымі.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Абітурыент—2016*

# Рэкорды прыёмнай кампаніі

## Рост балаў на ЦТ павысіў прахадную планку ў ВНУ

**У вышэйшых навучальных установах краіны прыёмная кампанія выйшла на фінішную прамую. Сёння стануць вядомыя прозвішчы тых, хто «ўскочыў у апошні вагон», — быў залічаны на платную форму навучання. Чым жа запомніцца сёлетняя прыёмная кампанія? У першую чаргу, надзвычай высокімі прахаднымі баламі на шэраг спецыяльнасцяў.**

### Тэсты спрасціліся ці падрыхтоўка палепшылася?

382 балы неабходна было набраць сёлета, каб паступіць у БДУ на спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» і «Міжнароднае права». Для таго, каб вывучаць у Белдзяржуніверсітэце «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі», трэба было мець у сваім багажы не менш як 376 балаў, «Сусветную эканоміку» — 367 балаў, «Паліталогію» — 362 балы, «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму» — 361. На «Аўдыявізуальную журналістыку» прахадны бал склаў 370.

У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце спасцігаць кітайскую мову на перакладчыцкім факультэце будуць абітурыенты, якія здолелі набраць 377 балаў і больш (размова ідзе пра спецыяльнасць «Кітайская (на базе англійскай) і другая замежная мова»).

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Рэкорды прыёмнай кампаніі

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі прахадны парог на спецыяльнасці «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» склаў 374 балы. Сапраўдны аншлаг назіраўся і на спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў гульнявой індустрыі», дзе на адно месца прэтэндавалі 7,6 чалавека (прахадны бал — 361).

Як відаць, планка, якая дазваляе абітурыентам разлічваць на бясплатную вучобу ў ВНУ, працягвае павышацца. Як расце і колькасць абітурыентаў, якім не хапіла літаральна дзвятры балы да максімальнага выніку...

Так, выпускнік сталічнай гімназіі №61 Уладзіслаў Рэентовіч здаў на 100 балаў беларускую мову, фізіку і матэматыку. У суме са школьным атэстатам ён набраў 399 балаў з 400 магчымых і без праблем паступіў у БДУ на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Не давялося хваляваца за сваё паступленне на прэстыжны факультэт міжнародных адносін і выпускніцам бабруйскай гімназіі №3 Ірыне Івах і Ганне Зыкавай. Дзяржаўную мову, замежную і грамадазнаўства яны таксама здалі на 100 балаў. А ўвогуле на 100 балаў у гэтым годзе было напісана 330 тэставых работ (летась было 277 стабальных вынікаў). Вышэйшы бал па трох дысцыплінах — у трох чалавек, па двух прадметах — у 15 абітурыентаў.

Нават па такой традыцыйна складанай для абітурыентаў дысцыпліне, як фізіка, было зафіксавана 34 стабальныя вынікі і 25 — па матэматыцы. Парадавалі і вынікі ўдзельнікаў ЦТ па беларускай мове — на 100 балаў гэты прадмет здалі 50 чалавек — утрая больш, чым у папярэднім годзе.

**У БДУІР падлічылі: сярэдні бал першакурснікаў — 324!**

Цяпер усе выказваюць здагадкі: або тэсты максімальна спрасціліся, або абітурыенты сталі больш мэтанакіраванымі? У галоўным адукацыйным ведамстве схільныя лічыць, што выпускнікі школ сталі больш свядома падыходзіць да сваёй падрыхтоўкі. Па той жа матэматыцы павялічылася колькасць абітурыентаў, якія здалі тэст больш чым на 50 балаў, і зменшылася колькасць удзельнікаў ЦТ, якія не пераадолелі мінімальны парог.

На думку міністра адукацыі Міхаіла Жураўкова, ідэальнай сістэмы здачы экзаменаў няма і, напэўна, не будзе: «Той, хто добра здаў той ці іншы экзамен, будзе яго хваліць, а іншы, наадварот, будзе казаць, што ўсё дрэнна. Тая ж акалічнасць, што сярод прэтэндэнтаў на студэнцкі білет ёсць маладыя людзі, якія здалі на 100 балаў усе тры экзамены, сведчыць, што абітурыенты навучыліся рыхтавацца да тэстаў...»

Трэба заўважыць, што **высокая колькасць уладальнікаў максімальных балаў абумовіла надзвычай вострую канкурэнцыю паміж імі на асабліва прэстыжных у моладзі спецыяльнасцях.**

Увогуле ў Белдзяржуніверсітэце сёлета 63% залічаных на бюджэтную форму навучання па агульным конкурсе маюць сумарны бал сертыфікатаў 300 і вышэй. Узрасла сярод першакурснікаў і колькасць пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў. Такіх абітурыентаў у БДУ — 95, сярод іх 6 лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Кожны чацвёрты першакурснік скончыў сярэднюю школу з медалём або ўстанову сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай. Дарэчы, у БДУ сёлета канстатуюць рэкордна нізкі паказчык сярод залічаных на першы курс мінчан — 33,5%: гэта значыць, што вядучы нацыянальны універсітэт прыцягвае лепшых выпускнікоў з усёй краіны.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі сярод 1045 залічаных на першы курс малады людзей 300 балаў і больш маюць 73%. У прыёмнай камісіі падлічылі: сярэдні бал першакурснікаў — 324!

## Тэхнічныя спецыяльнасці: выбар лепшых з горшых?

Паколькі Беларусь з'яўляецца экспартна арыентаванай краінай, для яе эканомікі выключна важнае значэнне мае тэхнічная адукацыя. Патрэба ў высокакваліфікаваных спецыялістах расце, а патрабаванні да ведаў і прафесійных навыкаў становяцца ўсё больш жорсткімі. Разам з тым вельмі многія тэхнічныя спецыяльнасці не могуць пахваліцца якасным наборам першакурснікаў. Напрыклад, усяго 152 балы трэба было набраць сёлета, каб вучыцца ў БНТУ на будаўніка цеплавых і атамных электрастанцый. На спецыяльнасць «Суднабудаванне і тэхнічная эксплуатацыя воднага транспарту» прахадны парог склаў 118 балаў, «Дызайн гусенічных і колавых машын» — 118,3 бала, «Гарадскі электрычны транспарт» — 168, «Тэхналогія матэрыялаў і кампанентаў электроннай тэхнікі», «Рухавікі ўнутранага згарання» — 171.

У Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытуце імя А. Д. Сахарава БДУ, каб вывучаць энергаэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент, дастаткова было мець 142 балы.

У Беларускім дзяржаўным аграрна-тэхнічным універсітэце бюджэтнікі з самымі нізкімі адзнакамі будуць вучыцца на спецыяльнасці «Аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў і вытворчасцяў (сельская гаспадарка)». Для паступлення на яе хапала 118 балаў.



Фота Анатоля Клешчука.

У Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце прасцей за ўсё было паступіць на спецыяльнасць «Лясная гаспадарка» — усяго 131 бал для бюджэтнай формы навучання.

**100 балаў набралі на ЦТ па беларускай мове ў 50 чалавек, рускай мове — 86, грамадазнаўству — 62, біялогіі — 25, матэматыцы — 25, гісторыі Беларусі — 14, хіміі — 1, фізіцы — 34, замежных мовах — 33.**

Прахадны бал на «Тэхналогію дрэваапрацоўчых вытворчасцяў» — 137. Вышэйшым аказаўся прахадны парог на спецыяльнасці «Ахова навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» — 197. На «Біятэхналогію» патрабаваўся 261 бал. А самая запатрабаваная спецыяльнасць у тэхналагічным універсітэце — «Тэхналогія лекавых прэпаратаў», куды для паступлення патрабавалася 290 балаў. У той жа час дадатковы набор у БДТУ не абвяшчаўся — ва ўніверсітэце змаглі «закрыць» усе бюджэтныя месцы.

Патрэба ў дадатковым наборы нечакана ўзнікла ў БДУ на геаграфічным факультэце: на спецыяльнасці «Гідраметэаралогія», «Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў» і «Геаінфармацыйныя сістэмы (зямельна-кадастравыя)» залічылі ўсіх, хто падаў дакументы. Недабор ва ўніверсітэце звязваюць з не вельмі ўдала падабранымі профільнымі прадметамі: фізіка і геаграфія.

Дарэчы, у БДУ рыхтуюць і будучых атамшчыкаў. На фізічным факультэце ёсць спецыяльнасць «Ядзерная фізіка і тэхналогіі». Прахадны бал на факультэт склаў 167. Гэта пры тым, што працаваць у ядзернай галіне было прэстыжна ва ўсе часы, вось толькі вучыцца на адпаведных спецыяльнасцях даволі складана. Да таго ж і здаваць пры паступленні трэба фізіку і матэматыку. У педагагічных ВНУ менавіта гэты напрамак запаўняецца з цяжкасцямі: так, у Магілёўскім педагагічным універсітэце на «Матэматыку і інфарматыку» прахадны бал — 131, на «Фізіку і інфарматыку» — 134. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка пропуск на «Матэматыку і інфарматыку» — 172 балы, на «Фізіку і інфарматыку» — 143.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў спецыяльнасць з мінімальным балам (192) — «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць».

## Прафесіі будучыні ў каталогу найноўшых спецыяльнасцяў

Выкладчыкі канстатуюць, што абітурыенты тэхнічных ВНУ менш ведаюць пра абраную спецыяльнасць, чым нацэлены на паступленне ў медыцынскія, педагагічныя і творчыя ВНУ. Яны не могуць ацаніць уласныя здольнасці да інжынерна-тэхнічнай дзейнасці і маюць вельмі цьмянае ўяўленне пра будучую прафесію. Менавіта ў тэхнічных ВНУ ў апошнюю гадзіну перад закрыццём прыёмных камісій абітурыенты стыхійна (зыходзячы са сваіх балаў у сертыфікатах ) выбіраюць для сябе будучую спецыяльнасць. Але калі мітусіцца паміж факультэтамі, можна прабегчы свой лёс.

Многія прадстаўнікі вышэйшай школы таксама лічаць, што на конкурсы ўплывае і пазнавальнасць тых ці іншых спецыяльнасцяў. Для прыкладу, інфармацыйныя тэхналогіі — традыцыйна адзін з самых запатрабаваных абітурыентамі кірункаў. Але ёсць мноства вострa запатрабаваных спецыяльнасцяў, якія знаходзяцца на скрыжаванні праграмавання і інжынернай навукі. Напрыклад, спецыяльнасць «Аўтаматызаваныя электрапрыводы». Дзве трэціны электраэнергіі, што выпрацоўваецца ў свеце, выкарыстоўваюцца ва ўстройствах, якія адносяцца да электрапрыводаў. Тыя ёсць паўсюдна — ад швейнай машынкі да шматтонных пракатных станаў. Энергія — дарагая, і, натуральна, трэба ствараць найбольш эканамічныя мадэлі. Гэту задачу павінны вырашаць інжынеры, таму спецыяльнасць «Аўтаматызаваныя электрапрыводы» не проста сучасная — яна арыентавана на будучыню. Вось толькі старшакласнікам яна не падаецца прывабнай. Магчыма, калі б замяніць старамодную назву спецыяльнасці на сучасную, скажам, на «Камп'ютарызаваныя электрапрыводы» ці «Мехатронныя сістэмы і ўстройствы», яна прыцягнула б да сябе больш увагі з боку абітурыентаў?

Увогуле тыя крытэрыі, якімі доўгі час кіраваліся абітурыенты і іх бацькі пры выбары спецыяльнасці (прэстыжнасць, запатрабаванасць, высокааплатнасць і г.д.), сёння ўжо не спрацоўваюць. Тое, што здавалася надзейным і перспектыўным яшчэ ўчора, часта аказваецца эфемерным сёння і непатрэбным заўтра. Каб знайсці высокааплатную работу, мала быць проста праграмістам. Трэба валодаць унікальнымі кампетэнцыямі, быць над сярэднім узроўнем, ведаць і бачыць больш, чым іншыя. Кампаніі — рэзідэнты ПВТ усё часцей распрацоўваюць уласны прадукт, звязаны, напрыклад, з інтэрнэтам рэчаў. Безумоўна, для гэтага патрабуюцца праграмісты, але таксама патрэбны і спецыялісты ў пэўных прадметных галінах, якія могуць сфармуляваць задачу і вырашыць тэхнічную праблему.

Свет, прагрэс, а разам з імі і рынак працы развіваюцца надзвычай імкліва. Вельмі ўплывовы футуролаг тэхнічны дырэктар Google Рэй Курцвейл сцвярджае, што неўзабаве прагрэс стане настолькі хуткім і складаным, што чалавек ужо будзе не ў стане яго зразумець. Курцвейл адносіць гэты момант да 2045 года. Таму **адзінае, у чым могуць быць упэўнены сённяшнія абітурыенты, — што выбраная імі спецыяльнасць не зможа служыць ім заўсёды.** У залежнасці ад таго, як будзе развівацца эканоміка, куды будзе рухацца прагрэс і якіх прафесійных вышынь яны захочуць дасягнуць, ім давядзецца пастаянна абнаўляць старыя веды (або ўвогуле забыцца на іх з-за непатрэбнасці) і авалодваць новымі кампетэнцыямі.

Міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў паабяцаў у хуткім часе прэзентаваць грамадскасці каталог найноўшых спецыяльнасцяў, якія плануецца ўводзіць у беларускіх ВНУ пасля 2021 года. Размова ідзе пра падрыхтоўку спецыялістаў, якія будуць распрацоўваць беспілотныя канструкцыі, займацца робататэхнікай і іншых. Каталог збіраюцца апублікаваць загадзя для таго, каб даць вышэйшым навучальным установам час падрыхтавацца да ўкаранення неабходных для эканомікі нашай краіны спецыяльнасцяў...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Дапамагчы з выбарам*

# УДЗЕЛЬНІКІ СТАРТАПА... ВУЧНІ ШКОЛ

**Арганізатары адукацыйнага праекта TeensCool сцвярджаюць, што за кароткі час могуць навучыць старшакласнікаў асновам IT і разам з імі запусціць у вялікае жыццё новы стартап.**

— Па сутнасці, мы стварылі праект ранняй прафесійнай арыентацыі для старшых школьнікаў, удзельнікі якога могуць атрымаць першую адукацыю ў IT-кірунку, — уводзіць у курс справы **кіраўнік IT-школы Myfreedom Алена ДЗІНМАН**. — Задума — даць падлеткам працоўны досвед, магчымасць паспрабаваць сябе ў ролі айцішніка і прайсці ўсе стадыі развіцця разам са сваім стартапам. Каманда навучэнцаў разам прыдумляе праект, рэалізуе яго і праводзіць кампанію па прасоўванні прадукта. Кожны з удзельнікаў прымярае на сябе якуюнебудзь ролю: менеджара, бізнес-аналітыка, праграміста, тэсціроўшчыка і гэтак далей. Акрамя таго, мы часта наведваем вялікія IT-кампаніі Беларусі, супрацоўнічаем з Паркам высокіх тэхналогій. Прасцей кажучы, хочам, каб старшакласнікі паглядзелі на прафесію знутры, убачылі, як гэта працуе і зрабілі канчатковы выбар.

Усё пачынаецца з прафарыентацыі: навучэнцам расказваюць, якія прафесіі ёсць у свеце інфармацыйных тэхналогій, пра іх адметнасці. Наступны крок — бізнес-аналіз: дзеці вучацца ўзаемадзейнічаць з заказчыкам, складаюць тэхнічнае заданне для сайта. Далей — планаванне праекта і шэраг трэнінгаў: камандаўтварэнне, самапрэзентацыя, камунікацыя. Пасля кожны ўдзельнік выбірае для сябе ролю, якую будзе выконваць, і каманда прыступае да галоўнага — рэалізацыі і прасоўвання.

— Наш праект — гэта сайт для валанцёраў пад назвай «Dapamagi.by», — дзеліцца **выпускнік Ліцэя БДУ, наваспечаны студэнт першага курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Кірыл МІХАЙЛОВІЧ.** — Ён вылучаецца высокім узроўнем інтэрактыўнасці. Карыстальнік, які зарэгістраваўся на нашай платформе, зможа ствараць новыя валанцёрскія акцыі, а таксама шукаць цікавыя яму прапановы. Умоўна кажучы, нехта хоча правесці суботнік і прыбраць лісце ў парку каля дома, для гэтага яму патрэбны 20 валанцёраў. Зацікаўленыя заходзяць на сайт, бачаць інфармацыю, рэгіструюцца. Пакуль што нічога падобнага ў Беларусі няма. Рэсурс цяпер у стадыі распрацоўкі, ужо зроблены яго макет.

Як адзначае Алена Дзінман, у праекце ўдзельнічаюць вучні 9—11 класаў. Па яе словах, у гэтым узросце падлеткі ўжо свядома задумваюцца пра будучыню і гатовы дзеля яе мэтанакіравана і сур'ёзна працаваць. Цяпер у школе займаецца летняя група — 16 чалавек.

Праект TeensCool зараз працуе ў эксперыментальным рэжыме, і першыя групы займаюцца бясплатна. Заняткі ў школе падчас навучальнага года будуць каштаваць 92 рублі за месяц, працягласць курса — 9 месяцаў, як паўнавартасны навучальны год.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*



З Наталляй Лубнеўскай

# ЯК ЗНАЙСЦІ МАТЫВАЦЫЮ

**«Тоўстая дачка — гора ў сям'і». Такую «натхняльную» запіску павесіла мая сяброўка сабе на халадзільнік у спадзяванні, што гэта адвадзіць яе ад прысмакаў. Некалькі тыдняў паперка нагадвала пра непрыемныя наступствы звычкі есці па начах. Нагадвала, але не спыняла, таму давялося запіску прыняць. Каб не раздражняла.**

«Не трэба пробных заняткаў, дайце абанемент адразу на месяц. Інакш не дайду да залы, я сябе ведаю», — прасіла неяк адна з кліентак. Я бачыла яе толькі два разы. Астатнія шэсць аплачаных трэніровак так і засталіся нявыкарыстанымі.

Матывацыя — складаная штука. Інструктар у зале можа зрабіць для вас шмат: распісаць схему трэніровак, прадумаць рацыён харчавання. Адзінае, што не ў яго сілах, — прымусіць гэта выконваць. Натхніць, падбадзёрыць — калі ласка. Але пераадольваць сваю лянотy вам давядзецца самастойна.

Магу расказаць пра тыя хітрыкі, якія дапамагаюць даходзіць да залы мне.

На трэніроўку лепш ісці адразу пасля работы ці вучобы. Я стараюся так выбраць час, каб не заходзіць дадому, бо ўгаварыць сябе выбрацца адтуль (далей ад камп'ютара, утульнай канапы і каструлі з катлетамі), амаль немагчыма. Лепш не выпрабоўваць лёс.

Для заняткаў выбірайце адзенне, у якім падабаецеся сабе. Гэта чыста дзявочая тэма: калі ў шафе чакае абноўка, заўсёды знойдзеш падставу яе апрануць. У выпадку са спартыўнай формай вам прыйдзецца ісці трэніравацца хоць бы для таго, каб пакрасавацца. Я так аднойчы купіла прыгожую майку, а потым — у камплект да яе — абанемент у «трэнажорку». А цяпер успомніце старыя расцягнутыя ласіны, у якіх вы думалі займацца. Наўрад ці вам захочацца хутчэй апрануцца ў адзенне, у якім звычайна прыбіраеце дома.

Трэніруйцеся перад люстэркам. Па-першае, так будзеце бачыць, ці правільна выконваеце практыкаванне. Па-другое, у сярэднім занятак перад люстэркам доўжыцца больш, чым без яго.

Для кагосьці добрым стымулам становіцца спадніца, у якую не ўлазіш ужо пару гадоў, а ўлезці хочацца, ці гісторыі дзяўчат, якім удалося прывесці сябе ў форму. Але, мне здаецца, найлепшы матывавальны прыклад — твой асабісты. Скажу банальную рэч, але менавіта змены ў сабе натхняюць працаваць яшчэ і яшчэ: ты разумееш, што гэта рэальны вынік, а не фоташоп ці проста добрыя гены.

А вось у матывацыю ад зваротнага, калі развешваеш здымкі жанчын «у целе», да якіх не хочаш быць падобным, я не надта веру. Можаце атрымаць зусім не той вынік. Будзеце заспакойваць сябе, што вам да іх яшчэ далёка, і ўплятаць макарону з маслам за абедзве шчакі.

Некаторыя кажуць: што толку ў тых трэніроўках, калі астатні дзень сядзіш на крэсле? Не пагаджуся. Як мінімум той час, што вы займаецеся, дабіраецеся да залы, прымаеце душ, вы знаходзіцеся ўдалечыні ад халадзільніка, а значыць, пазбягаеце непатрэбных калорый. Самі ведаеце: калі няма чым заняцца, так і карціць чаргавы раз папіць гарбаты з бутэрбродам ці цукеркамі.

Да таго ж гэтая гадзіна руху лішняй не будзе. Амерыканскія навукоўцы высветлілі, што на працягу дня сядзець можна толькі 10 гадзін. Усё, што больш, дрэнна адбіваецца на стане сардэчна-сасудзістай сістэмы. У эксперыменце ўдзельнічала 720 тысяч чалавек ва ўзросце ад 18 гадоў і старэй. За імі назіралі 11 гадоў. І прыйшлі да высновы, што ўжо пасля 10 гадзін сядзення ў дзень рызыка развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў вырастае на 8 працэнтаў. А калі ў крэсле праводзіць па 12,5 гадзіны, рызыка дасягае 14 працэнтаў.

Каб не шукаць кожны раз перад трэніроўкай матывацыю, выберыце той від фітнесу, дзе вам будзе цікава. Не трэба «заганяць» сябе на бегавой дарожцы толькі таму, што кардыа добра спальвае калорыі, калі вам больш падабаецца ёга. Ці мучаць «сілавухай», калі душа просіць танцаў. Навошта вам яшчэ адзін нелюбімы абавязак? Калі прыемны не толькі вынік, але і сам працэс, спакусаў прапусціць трэніроўку куды менш.

*Закулiссе подыума*

# Адзін «клік», і ты мадэль

## А пасля — «рабочы конік»


Беларуская прыгажуня Ульяна ДРАЖЫНА.

**Гісторыя расіянкі Наталлі Вадзянавай вам падаецца казкай? А вось беларускія прыгажуні так не лічаць. Як змяніць сваё жыццё за адзін «клік»? Адказ ведае Ульяна ДРАЖЫНА. Дзяўчына адвучылася ў БДУ, знайшла працу... А што было далей, мы спыталі ў самой гераіні.**

— Я працавала ў турыстычным агенцтве і разумела: гэты занятак ужо надакучыў. У той момант мне «УКантакце» напісала дзяўчына-скаўт з мадэльнага агенцтва і сказала, што я іх зацікавіла. Яна папрасіла зрабіць снэпы: фотаздымкі і відэа без касметыкі. А месяцы праз чатыры мне прапанавалі першы кантракт у Інданезіі.

***— І не страшна было ехаць адной па запрашэнні?***

— Вядома, боязь была. Але ўсё атрымалася даволі ўдала. Па-першае, мне быў 21 год на той момант. Па-другое, па сутнасці, мяне нічога не трымала: не было цікавай работы, вучоба скончылася. Па-трэцяе, у гэтым агенцтве працавала мая знаёмая з Беларусі. Яна ўжо з'ездзіла ў адну паездку, і гэта было невялікай гарантыяй, што там усё бяспечна. Зразумела, што, калі б мне проста прапанавала нейкая «цётка з інтэрнэта» паехаць у Інданезію, я б сама сябе не пусціла. Акрамя фота і відэа, я праходзіла гутарку па скайпе. Цяпер досыць часта так шукаюць мадэляў без асабістых сустрэч. Я ўвогуле свайго менеджара ў жыцці ніколі не бачыла. Гэта звычайная практыка — звязвацца праз інтэрнэт.

***— Які б здымак ты параіла паставіць на аватарку ў сацыяльнай сетцы дзяўчатам, якія марацьаб прафесіі мадэлі?***

— Ніколі наконт гэтага не турбавалася. У мяне проста было шмат фатаграфій. Галоўнае, каб быў свой здымак, а не малюнак. А там ужо як пашанцуе.

Па-першае, не кожны зможа жыць далёка ад сваіх блізкіх. Па-другое, часта менавіта жылёвыя ўмовы могуць не адпавядаць вашым чаканням. Агенцтва, на якое вы працуеце, шукае для вас кантракты ў іншых краінах. Але ўмовы пражывання забяспечвае мясцовае агенцтва. І не трэба разлічваць, што ты будзеш жыць у шыкоўных апартаментах. Прыехаў, ты для наймальнікаў — цяглавая сіла. Па-трэцяе, многім здаецца, што ты прыйшоў, крыху пафатаграфаваўся, зарабіў шмат грошай і пайшоў. У Азіі, напрыклад, ёсць практыка здымаць каталог адзення 12 гадзін. А паколькі кожная гадзіна аплачваецца, яны лічаць ледзьве не кожную хвіліну. Спыняюць час, калі ты кудысьці адыходзіш. Гэта цяжкая фізічная праца. Ты не паспяваеш нават перакусіць. Скажу так: адчуванне, як быццам разгружаў вагоны.

***— Ці магчыма ў гэтай прафесіі зарабіць на «лепшае» жыццё?***

— Ты ніколі не ведаеш, вернешся з заробкам ці не. Таму што спачатку трэба адпрацаваць увесь «мінус»: кватэру, пералёт, кішэнныя грошы, якія даюць па кантракце. Пры гэтым кожная мадэль асабіста атрымлівае 50 працэнтаў ад заробку. У мяне быў такі вопыт у Інданезіі. Ты можаш працаваць, як конь, кожны дзень, і прыехаць з «нулём». Вельмі крыўдна, але гэта латарэя. Вядома, бываюць кантракты, калі ты едзеш з гарантыяй, з абяцанай стаўкай. Але для гэтага патрэбен вопыт. Па першым разе такое бывае рэдка.


Часам не фотасесіях трэба працаваць па 12 гадзін запар.

***— А колькі ў цябе было замежных кантрактаў?***

— Тры: у Інданезіі, Кітаі і Італіі. Першы кантракт быў на пяць месяцаў. Я па сваім няведанні паехала на такі вялікі перыяд. Другі і трэці — на тры месяцы. У першай паездцы жылі ў шыкоўных апартаментах са сваім басейнам унізе, з бясплатнай спартыўнай залай, у кожнай быў свой досыць вялікі пакой. Умовы выдатныя. А ў Ганконгу быў проста жах. Маленькія-маленькія пакойчыкі з двух'яруснымі ложкамі. Кухня — як запалкавы карабок. А ў Мілане наогул жылі некаторы час 9 чалавек у адной кватэры. Тым не менш больш за ўсё мне спадабалася ў Ганконгу. Сам горад называюць азіяцкім Нью-Ёркам. Я згодна. Там такая неверагодная архітэктура плюс горы і мора. Гэта спалучэнне Еўропы і Азіі.

***— Якія дзейнічаюць абмежаванні, каб не сапсаваць фігуру?***

— Я павінна на працягу ўсяго кантракта адпавядаць тым параметрам, з якімі прыехала. Кожны тыдзень трэба прыходзіць у агенцтва і вымярацца. Не ўсюды так робяць, але, я лічу, што гэта правільна. Дзяўчаты, калі іх не вымяраюць, расслабляюцца. У Азіі, напрыклад, ежа тлустая, і вельмі лёгка паправіцца. Калі ты пачынаеш набіраць вагу, цябе спачатку папярэджваюць. Калі нічога не змяняецца, напалову зразаюць кішэнныя грошы. Няма грошай — няма ежы. Гэта звычайная працэ. Але мяне гэта ні разу не закранула.

***— Калі ў мадэляў «пенсія»?***

— Усё залежыць ад таго, як ты выглядаеш. Сустракаліся і ў 30 гадоў маладжавыя, якія выглядаюць, як падлеткі. Іншая справа, ці цікавая яшчэ ў гэтым узросце такая праца? Я шчаслівы чалавек, што трапіла ў прафесію ўжо дарослай. Прыкладна ў 15 гадоў прайшла ў беларускі фінал конкурсу «Форд Супермадэль свету». Пачынаючы з гэтага моманту, пачала цікавіцца прафесіяй. У тым узросце, калі са мной пачало працаваць агенцтва, размова ішла пра тое, што трэба кідаць школу. На гэта, зразумела, не пайшла ні я, ні мае бацькі. Праз некаторы час прайшла кастынг у мадэльную школу. А калі паступіла ва ўніверсітэт, наогул, забылася на гэта. У нас у краіне можна і раней пачынаць працаваць такім чынам. Але ехаць за мяжу павінен ужо сфарміраваны чалавек. Часам падлеткам «зносіць дах» ад тых магчымасцяў, якія перад імі адкрываюцца. Асабіста я мяркую яшчэ некаторы час павандраваць і папрацаваць мадэллю. Цяпер чакаю новы кантракт.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

*Гарачы лёд*

# Паказаць найлепшы хакей

**Беларусь — краіна спартыўная. Кожны яе жыхар ведае, хто такія Вікторыя Азаранка, Максім Мірны, Аляксей Калюжны ці Аляксандра Герасіменя. У нас праводзіцца шмат розных буйных спартыўных мерапрыемстваў. Увесну ў сталіцы на пляцоўцы «Чыжоўка-Арэна» адбыўся чэмпіянат свету па хакеі сярод юніёраў І дывізіёна групы А. Зборная Беларусі тады правяла пяць матчаў, чатыры з якіх завяршыліся паражэннем саперніка. Беларусы, адолеўшы ў фінальным матчы каманду з Германіі, заваявалі пуцёўку ў элітны дывізіён чэмпіянату свету. Адным з лепшых гульцоў па версіі арганізатараў турніру стаў Леанід ІВАНОЎСКІ.**

Хакейная гісторыя хлопца пачалася ў чатыры гады. Бацька-плывец марыў, каб яго сын стаў хакеістам. «Спачатку я не хацеў гуляць, баяўся, плакаў, — прызнаецца Лёня. — Але, калі перамог дзіцячы страх, знайшоў у спорце сваё жыццё. Бацькі прывялі ў «Юнацтва», гэта і быў мой першы клуб, за які гуляў да 15 гадоў». Далей у біяграфіі — перыяд вучобы ў Аўстрыі: у акадэміі хакея Аканаган Лёня правучыўся год, але жаданне скончыць школу на Радзіме аказалася мацнейшым. З цеплынёй успамінае той час за мяжой: «З'явілася шмат сяброў. Гульні ў нас праходзілі па ўсёй Аўстрыі. Ездзілі ў Славакію, Чэхію, Германію, Венгрыю, Славенію. Але вучоба там была нялёгкая: калі зарабляеш дрэнныя балы — не допускаюць да гульняў».

Пасля заканчэння школы юнак паступіў у Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. «Жадання закінуць хакей і заняцца чымсьці іншым не было і няма. Нават думак такіх не ўзнікала. Цяжка, вядома, сумяшчаць і вучобу, і спорт, але я стараюся знаходзіць час для ўсяго».

Тыповы рэжым дня хакеіста складаецца з ранішняй трэніроўкі, вучобы, далей ідуць трэніроўкі на лёдзе і ў зале. І так кожны дзень, і толькі калі няма гульняў, ім даюць выхадны, але, як прызнаецца нападаючы, такое бывае рэдка.

Апошнія два гады Леанід гуляў за каманду «Дынама-Раўбічы», якая была створана на базе юніёрскай зборнай. У багажы маладога чалавека ўдзел за нацыянальную зборную Беларусі не толькі на чэмпіянаце свету па хакеі, але і ў Турніры чатырох нацый у Мінску, Даніі, у Кубку сталіцы, а таксама таварыскія матчы ў Чэхіі і Польшчы. На мінулым чэмпіянаце сярод юніёраў за гульнёй нашых хлопцаў назіралі тысячы вачэй. «Заўсёды адчуваецца адказнасць перад балельшчыкамі. Яны чакаюць ад цябе вынікаў, а ты, у сваю чаргу, імкнешся паказаць ім сваю лепшую гульню».

У хакеістаў ёсць мноства рытуалаў, каб прыцягнуць удачу падчас матча. Звычайна спартсмены пра іх не любяць расказваць, але



мой суразмоўца падзяліўся: «Калі перад гульнёй выходзім на пляцоўку, я праводжу рукой па лёдзе і цалую яго».

Напрыканцы нападаючы распавёў, што цяпер перад ім стаіць галоўная мэта — патрапіць у зборную U20. Акрамя гэтага, хакеіст марыць паспрабаваць свае сілы і за акіянам.

**Крысціна ЛЫЧКОЎСКАЯ,**
**студэнтка I курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
4 08 2016 г.

*Выпрабавана на сабе*

# ЗМЕНА Ў ЛАГЕРЫ,

## ці Дзесяць хлопчыкаў супраць адной студэнткі

**Ужо другі год запар замест канікул у вёсцы я выбіраю работу выхавацеля ў летніку. Васямнаццаць дзён на прыродзе сярод вялікай колькасці дзяцей дапамагаюць пераключыць сваю ўвагу з паўсядзённых побытавых клопатаў на нешта больш важнае, сапраўднае...**



**Такія позіркі азначалі толькі адно — хлопцы прыдумалі новую забаву. Трэба баяцца.**

Пра дзіцячы аздараўленчы лагер «Дубок», што знаходзіцца ў Пружанскім раёне непадалёку ад вёскі Паддубна, да чэрвеня я не ведала нічога. Як і летась, працу шукала праз раённыя камітэты БРСМ і згадзілася на першае прапанаванае месца. Таму дзе, з кім і ў якіх умовах мне давядзецца працаваць, я нават не ўяўляла.

Высветлілася, што абсалютная большасць выхавацеляў «Дубка» — студэнты, якія праходзяць тут педагагічную практыку або папросту хочуць зарабіць крыху грошай падчас канікулаў. Працавалі на нашай змене і некалькі маладых спецыялістаў са школ Пружанскага раёна. Але, што дзіўна, былі ў калектыве і педагогі са стажам. Напрыклад, настаўнік беларускай мовы Валерый Георгіевіч Купчанка, які ўжо адзінаццаць год працуе ў лагеры і называе сябе яго «ганаровым жыхаром». Ён даўно заслужыў рэпутацыю строгага выхавацеля, але дзеці паміж сабой кажуць: «Калі ты не пабываў у яго атрадзе хоць бы раз, то, лічы, што і лагер спазнаў не поўнасцю».

Напэўна, самы хвалюючы момант для выхавацеля — гэта заезд дзяцей. Менавіта ад першых гадзін знаёмства залежыць, як пройдзе ўся змена. Так атрымалася, што ў атрад, які мне даручылі, патрапілі толькі хлопчыкі 10- 11 гадоў. Мяне гэта адразу насцярожыла і нават крыху напалохала — ці змагу я, студэнтка непедагагічнага факультэта, справіцца з дзесяццю хлопцамі?

Крыху пазней стала зразумела, што перажывала я недарэмна. Адсутнасць дзяўчынак дужа ўплывала на паводзіны хлопчыкаў: яны ўвесь час намагаліся даказаць адно аднаму, хто з іх самы шумны, самы смелы і г.д. Або, бывала, толькі адвярнешся, а яны ўжо б'юцца паміж сабой. Карацей, за першыя некалькі дзён наш атрад паспеў вылучыцца сярод астатніх як той, дзе пастаянна парушаюць дысцыпліну, хоць па колькасці дзяцей ён быў самым маленькім.

Але, з іншага боку, такая энергічнасць дзяцей не давала мне расслабіцца ні на хвіліну. Яны на футбол — і я з імі бегаю па полі, яны на турнікі — і я качаюся побач на арэлях, у спякоту захацелі пааблівацца вадой — калі ласка, але толькі са мной. Тое ж самае тычылася ўдзелу дзяцей у конкурсах і мерапрыемствах: на сцэну выходзілі ўсе разам, а калі дрэнна падрыхтаваліся, дык было аднолькава сорамна і мне, і ім. Збольшага, праўда, творчыя выступленні ў нас праходзілі на «ўра». Ні адзін канцэрт не абыходзіўся без нашай «зоркі» — Кірыла Кабрынца. Актыўны хлопец не пабаяўся паўстаць перад гледачамі ў вобразе дзяўчыны, расказаць у мікрафон пра свае дзіцячыя боязі і прызнацца ў каханні ў вершаванай форме дачцэ дырэктара лагера. Астатнія ў атрадзе, раўняючыся на Кірыла, пасля таксама намагаліся сябе праявіць, і я іх у гэтым максімальна падтрымлівала.

Стаць «сваёй» у хлапчуковым атрадзе і наладзіць даверальныя адносіны мне збольшага дапамаглі размовы перад адбоем. Мы абмяркоўвалі ўсё, што здарылася з намі днём, строілі планы на заўтра, а праз некаторы час хлопцы пачалі дзяліцца са мной сакрэтамі. Аднак важна было не дазволіць ім забывацца на бяспечныя паводзіны. Слушную параду на конт гэтага дала **старшы выхавацель змены Наталля Міхайлаўна КОТЫШ**: «Трэба бачыць і чуць усё, але часам зрабіць выгляд, што не заўважаеш і не дачуваеш асобныя моманты».

Жыццё ў лагеры моцна адрозніваецца ад звычайнага, таму дзеці ў новых, нязвыклых абставінах маглі часам паводзіць сябе вельмі непрадказальна. У сувязі з гэтым я чарговы раз пераканалася: не варта абапірацца на чужое меркаванне аб іншых людзях. Паколькі большасць дзяцей прыязджае ў «Дубок» з Пружанскага раёна, настаўнікі мясцовых школ з многімі з іх працуюць падчас навучальнага года. З добрымі намерамі мае калегі намагаліся мне дапамагчы, расказаўшы пра тое, як «мае» дзеці паводзяць сябе дома, хто іх бацькі і іншае. Але нічым мне гэта не дапамагло, бо, напрыклад, Мікіта, якога ў школе лічылі «ціхуном», з першых дзён паказаў сябе самым галасістым у атрадзе, а яго брат Даніла — прызнаны хуліган — аказаўся, наадварот, сур'ёзным і адказным хлопцам, які заўсёды гатовы дапамагчы.

На здзіўленне многіх, чым часцей дзеці майго атрада траплялі ў непрыемныя сітуацыі, тым бліжэй мы з імі станавіліся. Напрыканцы хлапчукі-задзіры ад'язджалі дадому са слязамі на вачах — настолькі ім не хацелася развітвацца адно з адным, з «Дубком», і, вельмі хочацца верыць, — са мной.

...За васямнаццаць дзён у лагеры мы паспелі перажыць многае — гэта ўсё было настолькі запамінальным і яркім... Другі атрад, хоць і быў самым неспакойным, затое вясёлыя і весялейшы іншых ад душы. Спазненні ў сталовую, танцы і флэшмобы на вячэрніх канцэртах, зубная паста на падушках і неверагоднае жаданне высветліць, каго ўсё ж кахае адзінаццацігадовы Кірыл — Дашу ці Леру, — такой нам запомніцца другая змена лета 2016 года ў лагеры «Дубок».

**Ганна КУРАК, студэнтка VI курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# ЗАПІСАЦЦА Ў «КАРАЛІ ДАРОГ»...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Галоўнае, да чаго мы імкнёмся, — фарміраваць профільныя атрады, каб студэнты замацоўвалі на практыцы тое, што яны засвойваюць у тэорыі падчас навучання. Студэнты будаўнічага факультэта працуюць на будоўлях, факультэта транспартных камунікацый — на будаўніцтве дарог і гэтак далей. Звычайна работу ў атрадах залічваюць, як летнюю практыку. Я лічу, для студэнтаў гэта шыкоўная магчымасць — і вопыт атрымаць, і адпачыць, і грошай падзарабіць.

**«Нам ужо давалі заробак за адзін дзень, які мы адпрацавалі ў чэрвені, — 25 рублёў, значыць, за месяц павінны атрымаць каля 500».**

Першы аб'ект, на які мы накіроўваемся, — беларуска-кітайскі індустрыяльны парк «Вялікі камень» пад Смалявічамі, дзе працуе аднайменны атрад. Проста пасярод лесу пракладваюць асфальтаваную дарогу, усталёўваюць ліхтары — усё гэта нагадвае будаўніцтва новых мікрараёнаў у сталіцы. Аднак найбольш важная частка парка — індустрыяльны комплекс. Ужо хутка тут павінна размясціцца вытворчасць буйных кітайскіх кампаній, а пакуль што гудуць экскаватары, ездзяць машыны з бетонам і, вядома, працуюць будатрадаўцы.



**Атрад «Маладосць» узводзіць калектар для ачысткі вады ў Бараўлянах.**

— Да работы на аб'екце мы прыступілі 5 ліпеня, — кажа **камандзір атрада «Вялікі камень» Яўген ГРУНТОЎ.** — Асноўныя віды работ — вязка арматуры і каркасаў, устаноўка і дэмантаж апалубкі, заліўка бетону. Праца не патрабуе высокай кваліфікацыі, але дае вялікі досвед. Усяго ў атрадзе 20 чалавек, у асноўным гэта студэнты будаўнічага факультэта. Жывём мы ў Мінску, але штодзень нас каля станцыі метро «Барысаўскі тракт» забірае аўтобус, на якім прыязджаем сюды. Працоўны дзень — звычайны: восем гадзін плюс абед, у пяць вечара нас зноў адвозяць у Мінск.

— Пра магчымасць летняй работы ў будатрадзе я даведаўся ў штабе працоўных спраў БРСМ нашага ўніверсітэта, там мяне накіравалі сюды, — расказвае баец атрада, **студэнт III курса будаўнічага факультэта БНТУ Андрэй НАЗАРЭВІЧ.** — Не буду ўтойваць, у першую чаргу мяне цікавіла магчымасць прайсці практыку. Уражанні самыя добрыя, бо на такіх вялікіх будоўлях ты набіраешся карыснага досведу, які не атрымаеш больш нідзе. Працаваць тут будзем да 5 жніўня. Пасля тыя, хто захоча, могуць застацца надалей.

Яшчэ адзін аб'ект таксама знаходзіцца непадалёку ад Мінска. У Бараўлянах два дзясяткі студэнтаў з будатрада «Маладосць» дапамагаюць узводзіць калектарную станцыю, куды для ачысткі будзе сцякаць дажджавая вада з усяго пасёлка.

— Увогуле, я ўжо сёмы раз за час навучання прыязджаю ў будатрад, таму можаце не пытацца, ці падабаецца мне гэта, — усміхаецца **студэнт V курса будаўнічага факультэта БНТУ Арцём ФЕСЕНКА.** — Як так атрымалася? Некалькі разоў ездзіў на будоўлі падчас семестра. Да гэтага працаваў на Беларускай АЭС, будаваў інтэрнаты ў Студэнцкай вёсцы на вуліцы Чурлёніса, дапамагаў узводзіць новы будынак Нацыянальнага алімпійскага камітэта, Палац Незалежнасці — ужо нават цяжка ўсё прыгадаць. У асноўным займаюся вязкай арматуры і заліўкай бетону,



**А ў сталіцы байцы з тэхнічнага ўніверсітэта дапамагаюць будаваць трэцюю лінію метрапалітэна.**

гэта, лічыце, мой «профіль». Цяпер планую адпрацаваць адразу дзве змены, буду тут да канца жніўня.

— Работай студэнтаў БНТУ на нашым аб'екце я абсалютна задаволены, — кажа **начальнік будаўнічага ўчастка акцыянернага таварыства «Заслаўебудіндустрыя» Аляксандр НЯМІРСКІ.** — Хлопцы ў сваёй большасці талковыя, тэарэтычных ведаў у іх хапае, маюць уяўленне аб будаўнічых працэсах. Застаецца толькі падмацаваць гэта практыкай, чым мы тут і займаемся. Ніякіх праблем з імі ў нас няма. Яны адразу ж уліваюцца ў калектыў, не цураюцца цяжкай працы і ўсё робяць нароўні з іншымі. Студэнты працуюць пад маім кіраўніцтвам штогод, і ніколі ў нас не было непаразуменняў. Некаторыя прыязджаюць другі год запар. Скажу больш — калі б была такая магчымасць, я б узяў іх да нас на работу — маладыя інжынеры заўсёды патрэбны.

Галоўны сталічны аб'ект, дзе працуюць студэнты БНТУ, — трэцяя лінія Мінскага метрапалітэна. Іх мы знаходзім непадалёк ад плошчы Францішка Багушэвіча, дзе яны дапамагаюць перакладваць камунікацыі. Дарэчы, тут шчыруюць ужо «транспартнікі», бо гэта праца бліжэй да іх навучальнага профілю.

— Высокакваліфікаваную работу нам, на жаль, выконваць пакуль нельга, — расказвае **камандзір атрада, студэнт IV курса факультэта транспартных камунікацый Аляксандр ЖАРДЗЕЦКІ.** — Таму працуем падсобнымі рабочымі: займаемся пагрузкай і разгрузкай матэрыялаў, выстаўленнем агароджаў, знакаў. Усяго тут знаходзіцца 10 студэнтаў. Графік у нас звычайны — з 8 раніцы да 5 вечара, але часам выпадаюць вячэрнія і нават начныя змены, бо метро будуецца кругласутачна. Наконт грошай нічога сказаць пакуль не магу. Але нам ужо давалі заробак за адзін дзень, які мы адпрацавалі ў чэрвені, 25 рублёў, — значыць, за месяц павінны атрымаць каля 500.

Хлопцы кажуць, што большая частка студэнтаў факультэта транспартных камунікацый задзейнічана на будаўніцтве трэцяй чаргі МКАД-2, там працуюць амаль 40 байцоў з атрада пад гучнай назвай «Каралі дарог». Яны выконваюць асфальтабетонныя, геадэзічныя і земляныя віды работ. Дарэчы, атрады з БНТУ працуюць не толькі на знакавых аб'ектах сталіцы і Мінскай вобласці, але і на Гродзеншчыне. У тым ліку на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі Беларускай АЭС у Астраўцы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*lyskavets@zviazda.by*

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



**Правільна адпачываць — таксама цэлая навука!**

*Працоўны семестр*

# КАНІКУЛЫ Ў БЕЛЫХ ХАЛАТАХ

**Сёлета ў галоўнай медыцынскай ВНУ краіны — Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце — былі сфарміраваны 23 студэнцкія медыцынскія атрады, у якія ўвайшлі 348 студэнтаў. Апроч таго, падчас прыёмнай кампаніі былі задзейнічаны два сервісныя атрады.**

— Цяпер нашы студэнты працуюць на базе ўсіх бальніц Мінска, — расказвае **начальнік штаба працоўных спраў БДМУ Дзмітрый ФРАЛЕНКА.** — Акрамя таго, у сярэдзіне жніўня медатрады паедуць працаваць у Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, што ў Бараўлянах. Дзве асноўныя пасады, на якія мы ўладкоўваем удзельнікаў, — санітар і медсястра. Першымі працуюць студэнты малодшых курсаў, бо гэта простая работа, якую могуць выконваць навучэнцы любых спецыяльнасцяў. А вось чацвёртакурснікаў і старэйшых мы ўладкоўваем як медсясцёр, і яны ўжо працуюць па сваіх навучальных профілях.

Самае важнае патрабаванне для работы ў студэнцкіх медыцынскіх атрадах — адсутнасць акадэмічных запазычанасцяў і добрыя адзнакі. У адрозненне ад многіх іншых байцоў, медыкі працуюць круглы год. Таму ў канцы лета медатрады не толькі не расфарміроўваюцца, а, наадварот, напаўняюцца новымі людзьмі.

— Галоўнай нашай праблемай была тая акалічнасць, што студэнты працуюць у розныя дні і адно з адным перасякаюцца мала, — дадае Дзмітрый Фраленка. — Таму галоўны складнік жыцця студатрада — сяброўства і стасункі паміж байцамі — знікае. Але мы гэта пытанне вырашылі. Мінская гарадская арганізацыя БРСМ арганізоўвае для ўдзельнікаў атрадаў рознага кшталту мерапрыемствы. Напрыклад, надаўна група студэнтаў хадзіла на картынг, іншыя гулялі ў пейнтбол, ездзілі на экскурсію ў Санкт-Пецярбург. Такіх мерапрыемстваў вельмі шмат, гэта дапамагае нам стварыць сапраўдны сяброўскі калектыў.

Згодна з указам Прэзідэнта, студатрады вызваляюцца ад выплаты падаходнага падатку. Яшчэ адзін важны аспект — яго ўдзельнікі не плацяць узносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Палова ад гэтых сродкаў перанакіроўваецца ў Цэнтральны камітэт БРСМ, другая — на рахунак прымаючага боку, у нашым выпадку, установы аховы здароўя. За гэтыя грошы бальніца набывае для студэнтаў праязныя білеты, спецадзенне і іншае.

У Гарадской клінічнай бальніцы хуткай дапамогі цяпер працуюць два атрады: імя М.Н. Бурдэнкі і І.П. Паўлава. У дзень нашага візіту на базе прыёмнага аддзялення для траўматалагічных хворых дзяжураць двое са студэнтаў БДМУ: **пяцікурснік педыятрычнага факультэта Уладзіслаў ПАЛІШЧУК і чацвёртакурснік лячэбнага факультэта Віктар СЯМАК.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Уладзіслаў Палішчук працуе на пасадзе медбрата, таму мае правы накладваць гіпс.

— Пра магчымасць летняй працы ў медатрадзе я даведаўся ад сваёй сяброўкі, — кажа Уладзіслаў. — Пабачыў шмат цікавага, асабліва мне спадабаліся штомесячныя мерапрыемствы для байцоў. Працаваць нам у любым выпадку трэба, а тут яшчэ і шэраг бонусаў — чаму б не паспрабаваць? Ці спраўдзіліся чаканні? Мне падабаецца, што нас імкнуцца зрабіць калектывам, гэта вельмі важна для нашай будучыні.

Вядома, студэнцкі атрад — гэта не толькі адпачынак, а, у першую чаргу, праца. Дзяжураць стажоры па сутках — 24 гадзіны. Працоўны дзень пачынаецца ў 8.30. Падчас навучальнага года дзяжурства прыпадае на выхадныя, атрымліваецца чацвёра сутак за месяц — неабходны мінімум для працы на палову стаўкі. Летам студэнты працуюць суткі праз двое ці трое.

— У медатрадзе пры бальніцы хуткай дапамогі я трохі больш за год, — кажа Віктар. — Паколькі на момант прыходу сюды яшчэ не скончыў тры курсы, уладкаваўся санітарам. Мае абавязкі простыя: уборка памяшканняў і паверхняў, транспарціроўка хворых, работа з адходамі, падрыхтоўка інструмента да здачы ў стэрылізацыйную камеру. Акрамя таго, дапамагаю дактарам і медсёстрам. Напрыклад, падчас упраўлення канечнасцямі ці іншых дзеянняў, якія патрабуюць фізічнай сілы. Вядома, работа нескладаная, але яна дае пэўны досвед, бо ты прызвычайваешся да рытму жыцця ў бальніцы...


Віктар Сямак і Уладзіслаў Палішчук здымаюць кардыяграму.

Уладзіслаў як студэнт старэйшага курса — на пасадзе медбрата і можа выконваць больш адказную работу. Падчас дзяжурства ён займаецца прыёмам пацыентаў і іх рэгістрацыяй, а таксама працуе ў двух кабінетах: перавязачным і гіпсавым. Рабіць унутрывенныя ін'екцыі, забор крыві, упраўлянні канечнасцяў — усё гэта яго абавязкі.

— Студэнцкія атрады працуюць на базе нашай установы аховы здароўя ўжо на працягу трох гадоў, — гаворыць **выканаўца абавязкаў галоўнай медыцынскай сястры Гарадской клінічнай бальніцы хуткай дапамогі Таццяна КАРАТКЕВІЧ.** — Нашы штатныя супрацоўнікі, якія ўзаемадзейнічаюць са студэнтамі, задаволены ўзроўнем іх падрыхтоўкі і стаўленнем да працы. За ўвесь час ніякіх дысцыплінарных спагнанняў і нават вусных нараканняў на ўдзельнікаў атрадаў не было. Але самае галоўнае — я чую ад дактароў, старшых сясцёр, што яны былі б рады бачыць гэтых хлопцаў і дзяўчат сярод нас. Думаю, гэта найлепшая пахвала.

Размаўляем з медатрадаўцамі пра заробак. Паводле іх слоў, ён залежыць ад стаўкі і пасады. Уладзіслаў атрымлівае 180 рублёў, Віктар — трохі больш за 100.

— Што самае складанае ў нашай працы? — перапытвае Уладзіслаў. — У мяне ніякіх эксцэсаў не было, адзінае, што часам трапляюцца не самыя выхаваныя пацыенты. У любым выпадку, праца медыка — гэта работа з чалавекам, таму заўсёды будуць здарацца непаразуменні. Трэба вучыцца знаходзіць выйсце з канфліктных сітуацый. Безумоўна, цяжка сумяшчаць вучобу і работу, гэта сур'ёзна вымотвае. Але аб выбары прафесіі асабіста я не шкадую.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Быць пры справе*

# Да дрэў у гадавальнік

## Як вырасціць лес у... касетах

**За сем кіламетраў на ўсход ад Лагойска ў велізарным лясным масіве ёсць «голая» пляма ў форме ідэальна роўнага квадрата. Гэта — гадавальнік мясцовага лясгаса, месца, дзе ў літаральным сэнсе нараджаецца адно з галоўных прыродных багаццяў Беларусі. Штодзень, акрамя выхадных, сюды прыязджае аўтобус з навучэнцамі школ, якія дапамагаюць дарослым даглядаць маладыя дрэўцы. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» пабывалі ў гадавальніку і даведаліся, што прымусіла хлопцаў і дзяўчат правесці сваё лета з матыкай у руках.**

— Падпрацоўку школьнікаў на базе лясгаса мы арганізуем сумесна з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі ўжо два гады, — расказвае **начальнік гадавальніка Вера КУКШТЭЛЬ.** — Лагер працуе заездамі працягласцю па тры тыдні: першыя дзеці былі ў нас з 6 чэрвеня, іншыя — з 4 ліпеня. Запісацца ў яго могуць школьнікі, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту, і толькі з дазволу бацькоў, — гэты момант прапісаны ў заканадаўстве. Асноўны від работ, на якіх задзейнічаны байцы атрада, — праполка саджанцаў. Заробак у першую чаргу залежыць ад аб'ёму выкананай працы.

Начальнік гадавальніка кажа, што тут ёсць і дзеці, якія ўладкоўваюцца на работу самі, без пасрэдніцтва БРСМ. Але прыязджаюць усе разам — на спецыяльным аўтобусе, які прыбывае на месца а 9-й гадзіне. У 13 ён адпраўляецца па зваротным маршруце: больш за 4 гадзіны ў дзень дзецям працаваць нельга.

— Я тут ужо другі заезд запар, — усміхаецца **вучаніца 9 класа лагойскай гімназіі Марыя КРУГЛЕНЯ.** — А ўвогуле ўпершыню працавала ў гадавальніку яшчэ год таму. Пра магчымасць уладкавацца сюды пачула ад знаёмых дзяўчат. Летам у мяне шмат вольнага часу, рабіць няма чаго, а грошы ніколі лішнімі не бываюць. У Лагойску не так шмат месцаў, куды бяруць школьнікаў, гадавальнік — адно з іх. Сёлета плануем з сям'ёй адправіцца на адпачынак на Браслаўскія азёры, частку грошай я зарабіла сама. Праўда, падчас першага заезду атрымала ўсяго 50 рублёў. Шчыра скажу, работа не з простых, асабліва на адкрытых пасадках.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ялінак у адной гэтай цяпліцы — на ўвесь раён.

Агульная плошча гадавальніка складае амаль 24 гектары. Уся яна разбіта на так званыя пасяўныя і школьныя аддзяленні. У першых засяваюць у асноўным хвойныя пароды, якія пасля выкарыстоўваюцца для стварэння лясных культур. У школьных аддзяленнях растуць віды, якія высаджваюць на тэрыторыях розных установ і маюць у першую чаргу дэкаратыўную каштоўнасць. Акрамя гэтага, тут ёсць паравыя палі. Гэта тэрыторыі, якія засейваюць сідэратамі, — культурамі, якія ўзбагачаюць глебу карыснымі рэчывамі. Такой раслінай з'яўляецца, напрыклад, масляністая рэдзька.

**Памятаеце, некалі адзін хлопчык вельмі хацеў у Тамбоў? Таму што «чыкі-чыкі-чыкі-чыкіта»! У пэўным узросце ва ўсіх нас узнікаюць жаданні, увасабленне якіх у жыццё становіцца найпершай марай. Дык вось, пра «той» самы ўзрост... У кампаніі джэнтльменаў не заведзена гаварыць аб прысутных, таму, як той казаў, з задавальненнем пра іншых. («Не пытайцеся ў мяне парады, таму што маё пачуццё гумару мацнейшае за пачуццё жалю».) А ў іншых гісторыі збольшага аднолькавыя. Што некалі паводзілі сябе, «дарваўшыся» да самастойнасці, як тыя... Ведаеце анекдот у тэму? «Купіла баба дзеду новыя галёшы, дадому ідзе, у руках іх нясе. Бачыць, каля шапіка кардонка стаіць. Бабка туды і паклала абнову — усё ж у ёй несці зручней. Ідзе далей яшчэ больш задаволеная, а ўсе мінакі ёй усміхаюцца. Нарэшце нехта пытаецца: «Бабка, і наколькі вам іх хопіць?» — «Вой, сынок, як мой дзед шаркае, дык хоць бы на месяц!» А не бачыць, што на падабранай кардонцы надпіс: «Прэзервативы. 1000 штук». Ну, вы зразумелі, пра што я. «Чыкі-чыкі-чыкі-чыкіта»...**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Чаго гэта я завёў такую размову, пытаецеся? Ды вось чарговае даследаванне вучоных на вочы патрапіла... Аказваецца, нікому зараз асабліва і не трэба ў «Тамбоў». Гаворачы словамі з той жа песні, «не лятаюць туды сёння самалёты і не едуць нават паязды». Гэтым разам вызначыліся канадцы. Яны, правёўшы даследаванне з удзелам больш як 30 тысяч чалавек, абвергли стэрэатып пра тое, што для закаханых шмат сексу не бывае, і што чым яго больш, тым лепш. (А яшчэ нядаўна лічылася зусім інакш. «Калі ў цябе няма сексу, значыць, у некага яго два».) Канадскія вучоныя прыйшлі да высновы, што ў тых пар, якія часцей займаюцца каханнем, наадварот, не ўсё так добра ў адносінах. («Жонка з мужам ноччу ў ложку. «Дарагі, ты спіш?» — «Не». — «А хочаш?» Муж радасна: «Хачу!» — «Тады спі!»)... Ведаеце, усё тая ж песня не адпускае пасля гэтых слоў (падпявайце, хто памятае і хто згодны): «І з прычала нейкі хлапчук аб бядзе раптам сваёй пракрычаў. Вецер фразу знёс, хлопец сеў на пясок...» А вось там, дзе ёсць сапраўдныя пачуцці, шмат сексу і не трэба, гавораць даследчыкі. («Уначы жонка ўстае з ложка. «Ты куды?» — «Пайду гляну, ці не забыліся выключыць святло на кухні». — «І мне кавалачак прынясі»).

> **«Вопыт пражытых гадоў падказвае, што адносіны, заснаваныя на ўзаемных «падколах», — самыя трывалыя і даўгавечныя»**

Даследчыкі нават, каб упэўніцца ў сваіх назіраннях, пайшлі на паўторнае апытанне сярод удзельнікаў эксперыменту. («Брытанскія вучоныя высветлілі, але не змаглі патлумачыць, што менавіта».) Ім было важна даведацца пра аптымальную колькасць «таго самага», якая дапамога захаваць гармонію ў адносінах. І вось што высветлілася. Моцным парам, дзе ўсё трымаецца на любові і даверы, на цікаўнасці адно да аднаго, сексу хапае і адзін раз на тыдзень. А вось тыя, у каго ён здараецца нашмат часцей, прызналіся, што блізкія да поўнага разладу ў адносінах. («22.00. — Любы, што для цябе важней — я ці футбол? — 23.45. — Канешне ж ты!»). Аказваецца, для сямейных пар («Я дзяўчына прыстойная, да вяселля гатаваць не буду») секс у вялікай колькасці ўвогуле не такі важны, як падавалася раней. Да такой высновы ўжо англійскія вучоныя спрычыніліся (ну, як без іх у такой важнай справе?!). Яны падчас доўгіх даследаванняў прыйшлі да вываду, што залогам якаснага — не толькі сямейнага, але і інтымнага — жыцця з'яўляецца моцнае сяброўства. («Вопыт пражытых гадоў падказвае, што адносіны, заснаваныя на ўзаемных «падколах», — самыя трывалыя і даўгавечныя»). Вучоныя правялі апытанне сярод добраахвотнікаў і высветлілі, што калі ў пары давяральныя, сяброўскія стасункі, тады і інтымны бок сумеснага жыцця іх задавальняе. («Давай пераспім?» — «Хто каго?»).

Чым усё гэта можна патлумачыць? Даследчыкі ўсіх краін пішуць, што сямейныя пары ўвогуле сталі менш цікавіцца выкананнем «тых самых» абавязкаў, — мауляў, гэта наступствы колішніх секс-рэвалюцый, што пракаціліся ў розныя часы па планеце. Тое, што даступнае, стала менш жаданым, адпаведна, і цяга знікае. («У сувязі з павышанай радыяцыяй і паніжанай патэнцыяй Міністэрства аховы здароўя звяртаецца да ўсіх жанчын краіны: просьба больш за тры хвіліны не «ламацца».) А можа, справа яшчэ і ў сучасных тэхналогіях, якія замянілі многім рэальны свет? Ці мы перасталі быць рамантыкамі? Нейкі прафесар Роберт Кіснэр выказаў на гэты конт цікавую гіпотэзу (так і не атрымалася высветліць, адкуль навуковец, таму яго словам неабавязкова давяраць). Ён сцвярджае, што каханне з першага погляду — глупства. Гаворыць, што закахацца можна толькі ў чалавека, які пры першай сустрэчы вам ўвогуле не спадабаўся. («Адзін раз я быў у такіх сур'ёзных стасунках, што мы нават не ўсміхнуліся ні разу»). Інакш кажучы, каб вас пакахалі, не спрабуйце спадабацца пры першай сустрэчы. («Яна так міла падміргвае! — Гэта тараканы ў яе галаве жалюзі рамантуюць»).Тады да вас будуць ставіцца менш прадузята і, магчыма, разгледзяць у вас тую самую сваю палавінку. Бо калі нам хтосьці адразу не спадабаўся, мы пачынаем крытычна мысліць, аналізаваць, больш думаць пра чалавека і, як вынік, можам закахацца.

Песню пра хлопчыка, які хоча ў Тамбоў, не забыліся яшчэ? У ёй жа ўсё так і было. Пасля праліўных юнаком слёз «ты падбегла да яго, села побач каля ног і сказала: не трэба вады... На цябе паглядзеў ён крадком, і слязінка блiснула агнём. Ад усмешкі яго стала спякотна, вам так весела стала ўдваіх. Руку ён працягнуў і прамовіў: «Пайшлі», мора ціха спявала: «Смялей...» Чыкі-чыкі-чыкі-чыкіта!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Ідэй хапае на два альбомы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



**Аляксандр:** — Зараз рыхтуем новы альбом, вырашылі, што марудзіць і рабіць вялікія перапынкі паміж дыскамі ўжо нецікава. Хочацца запісваць больш матэрыялу, рабіць нешта новае. Ідэй хапае ўжо і на два альбомы наперад.

**— А якія яны будуць? Падобныя на «Лекавыя травы» ці папярэдні — «Рэкі прабілі лёд»?**

**Аляксандр:** — Канешне, не падобныя. Навошта людзям адно і тое ж прапаноўваць. Тым больш, што мы самі, пакуль ёсць імпэт і жаданне, хочам рабіць розную музыку, шукаць новыя гукі, новыя спосабы іх утварэння.

**— Чым натхняецеся ў гэтых пошуках? Зразумела, што ў вашых песнях гучаць фальклорныя матывы. Але ж тут не толькі фальклор...**

**Аляксандр:** — Гэта комплексна, яно збіраецца па жыцці. Ты бачыш цікавыя музычныя рэчы, проста слухаючы розныя запісы. Вандруючы па Беларусі, можаш захапіцца краявідам, людзьмі, з якімі сустракаешся і гутарыш, бачыш іх твары, эмоцыі. Натхняюць падарожжы, а яшчэ — вывучэнне тэорыі музыкі, калі гэта робіш не па прымусе, а па ўласным жаданні, з унутранай цікавасцю адкрываеш новыя шляхі для таго, каб зрабіць музыку добрай.

**Віталь:** — Складана сказаць дакладна, чым я натхняюся. Мы шмат рэпетуем, ёсць час, каб спрабаваць усё што заўгодна, сумесная праца таксама натхняе.

> **«Зараз рыхтуем новы альбом, вырашылі, што марудзіць і рабіць вялікія перапынкі паміж дыскамі ўжо нецікава».**

**— Вы сябруеце паміж сабой у гурце?**

**Аляксандр:** — Калі б мы былі проста калегамі, нам было б, напэўна, нецікава і некамфортна ў асабістых стасунках. Сяброўства ў музыцы, сугучча ў густах — самы дарагі капітал, што ёсць у гурта. У нас няма творчых спрэчак, заўсёды ўсё робіцца так, як усім падабаецца. Калі ўзнікаюць пытанні, то неістотныя, іх і спрэчкамі назваць нельга.

**— Няма строгага дыктату з боку лідара?**

**Аляксандр:** — Ёсць дыктатура добрай музыкі *(смяецца)*... Ніколі не дапусцім халтуры, калі нешта недакладна прадуманае, стараемся зрабіць добра, не лянуемся. Калі запісвалі «Лекавыя травы», маглі аб 11-й раніцы пачаць запіс і толькі а 3-й ночы пайсці спаць, перапынкі былі толькі на каву і ежу.

**— Сёння часам можна пачуць меркаванне, што музыка, якую запісваюць новыя гурты, аднолькавая. Многія наўмысна ці выпадкова капіруюць ужо вядомыя рэчы. Паўтараюць самі сябе. Вам хочацца зрабіць музыку адметнай, каб яна вылучалася на беларускай сцэне?**

**Аляксандр:** — Хочам і робім. Мы прыслухоўваемся да водгукаў, якія атрымліваем ад слухачоў, гэта могуць быць і дарослыя, дасведчаныя музыкі, і проста гараджане, якім нецікава разбірацца ў стылях. Імкнуліся рабіць арыгінальную музыку, і ў прынцыпе водгукі паказваюць, што вынік адпавядае гэтаму імкненню.

**— Ваша музыка за час творчасці досыць моцна змянілася. Раней песні Re1ikt мне падаваліся надта флегматычнымі, наўмысна зацягнутымі. Цяпер жа яны сталі больш разнастайнымі па форме, больш жывымі...**

**Віталь:** — Хочацца паспрабаваць іграць па-рознаму. У свой час мы хацелі запісаць такі альбом, як «Рэкі прабілі лёд», навошта рабіць яшчэ адзін падобны?

**Аляксандр:** — Трэба заўсёды рухацца далей, не спыняцца. «Рэкі...» мы наўмысна рабілі па асаблівай формуле: каб у песні ніводны кавалачак не паўтараўся. Там кожны наступны куплет ці прыпеў адрозніваецца ад папярэдняга. Гэты альбом даволі добра быў адзначаны крытыкамі і слухачамі па-за Беларуссю, у Еўропе дыску ставілі высокія адзнакі. Але ў нашай краіне яго знайшлі, хутчэй, нудным. Нічога страшнага. Гэта нармальна. Але мне здаецца, што мінорны лад захаваўся і ў «Лекавых травах», адзінае, што песні сталі больш рытмічныя, мы перасталі ламаць памеры, змяняць тэмп.

**— У гурта досыць многа ўсялякіх узнагарод — як адзнак прафесіяналаў, так і слухачоў, музычных журналістаў. Яны для вас важныя?**

**Аляксандр:** — Дзіўна, але мы ніколі не атрымлівалі адзнакі за лепшы дэбют. Адразу былі названыя «Гуртом года», атрымалі прыз за найлепшы «Альбом года».

**Віталь:** — Канешне, узнагароды для нас важныя, прыемна, калі адзначаюць тваю працу. Але гэта не самае галоўнае.

**— Што ж тады галоўнае?**

**Віталь:** — Людзі, якія прыходзяць на канцэрты, слухаюць нас, падыходзяць пасля выступленняў; для нас важна, калі можа адбыцца невялікая размова.

**— А вось некаторых музыкантаў стасункі з публікай, наадварот, вельмі стамляюць, і яны аддаляюцца ад яе пасля выступленняў. Вы спецыяльна да прыхільнікаў выходзіце? На прэзентацыі «Лекавых траваў» нават арганізавалі фотазону, дзе слухачы маглі сфатаграфавацца з гуртом.**

**Віталь:** — Гэта таксама частка музычнага шоу. Канцэрт не павінен абмяжоўвацца толькі выступленнем.

**Аляксандр:** — Фотазона — нармальная практыка ў іншых краінах. Нават на немузычных імпрэзах ёсць спецыяльныя месцы, дзе можна сфатаграфавацца на памяць. Для нас зладзіць такое месца было нескладана, затое так мы далі слухачам магчымасць захаваць новыя кавалачкі ўспамінаў з нашага канцэрта. Калі гурт развіваецца, ідзе далей, то ён прадстаўляе не толькі музыку. Гэта ўжо пэўная міфалогія, якую стварае каманда.

> **«Ніколі не дапусцім халтуры, калі нешта не дакладна прадуманае, стараемся зрабіць добра, не лянуемся».**

**— Над чым працуеце зараз?**

**Аляксандр:** — Над сабой, а ў планах — зрабіць нашую музыку яшчэ лепшай, канцэрты — больш захапляльнымі. Наша мэта рабіць так, каб творчасць Re1ikt аб'ядноўвала людзей розных музычных густаў. Рыхтуем на восень новы альбом, які будзе складацца з розных запісаў з 2013 па 2016 год, якія не ўвайшлі ў іншыя дыскі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 03.08.2016 г.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Уладзімір Лайкоў ужо больш за трыццаць пяць гадоў выкладае беларускую і рускую мову і літаратуру ў Мётчанскай сярэдняй школе Барысаўскага раёна. Дабро, прыгажосць (якая выратуе свет) — гэта тое, што ён часта прапаведуе на сваіх уроках, і тое, што праз мастацкае слова ўласных твораў імкнецца пасеяць, абудзіць, узвялічыць у сэрцах чытачоў. Апавяданне «Спуджанае шчасце» — яркі таму прыклад. Можа быць, у наш тэхнагенны час з яго кліпавым мысленнем паэтызацыя інтымных пачуццяў праз паводзіны і думкі галоўных герояў — маладых людзей — падаецца і не дужа модным аўтарскім стылем, але сам факт такой «нямоднасці» выклікае толькі шкадаванне.**

**Алесь БАДАК.**

# СПУДЖАНАЕ ШЧАСЦЕ

*«У счастья нет завтрашнего дня: у него нет и вчерашнего; оно не помнит прошедшего, не думает о будущем: у него есть настоящее — и то не день, а мгновение».*

**(І.С. Тургенеў)**

На прагрэтай сонцам паляне квітнеў чабор. Здавалася, яго духмяны пах даносіў лёгкі ветрык далёка, ажно да бярозавага ўзлеску. А там, ніжэй, за пагоркам адлівала блакітныя хвалі рака яго жыцця — Бярэзіна.

Уся Алесева істота была напоўнена цёплымі краскамі чаканага лета. Яго маладое цела прагла жыцця, вады, характва, кахання...

Яшчэ ўчора нічога пэўнага, акрэсленага не існавала. Алесю вельмі падабалася Яніна. Раз-пораз яго позіркі былі там, дзе ўзнікала яна. Ён любаваўся ею мілавідным тварыкам, невялікімі карацелькамі-косачкамі, убранымі ў два бэзавыя банцікі. Слухаў звонкі і напеўны голас. Быў у замілаванні ад «зорачак у выгнанні...», пра якія спявала Янінка. Хацелася схавацца ў яе блакітных вачах. Ды хіба толькі схавацца — застацца там назаўсёды! Вось толькі адна незадача. Адзін са знаёмых яму хлопцаў — Мікола — таксама, мабыць, жыў гэтымі мроямі-чаканнямі. І што асабліва бянтэжыла Алеся: Яніне былі даспадобы заляцанні Міколы. Яна смяялася. Гарэзнічала, спявала. Яна звяртала на сябе ўвагу.

Але сёння вечарам моладзь збіраецца побач з палянкай, дзе так пахне чабор. Там будзе весела. Будзе многа музыкі, гульняў і розыгрышаў. Алесю карцела пабыць там. Здавалася, нешта павінна сёння здарыцца.

Першы прыцемак агарнуў наваколле. Каля рэчкі, высока ў небе ўжо шугала полымя: пастараліся хлопцы, нацягалі з недалёкага лесу дроў. Яніна з акардэонам у руках вяла маладзевы рэй. Спявала песню за песняй, хто мог і хацеў, дапамагаў ёй у гэтым. «Чырвону руту не шукай вечарамі...», «У мяне ты адзіны!» Ах, як клаліся не столькі гукі, колькі словы гэтай вясёлай песні на трапяткое сэрца Алеся... «Вось быў бы я ў цябе адзіным... Бо ты — тая чырвоная рута, якую знайшоў я... — думаліся і паўтараліся неадчэпна ў галаве Алеся гэтыя словы, — якая ж ты прыгожая, якая ж ты недасяжная і якая жаданая, мілая мая Янінка!»

Яму так хацелася сказаць гэтыя словы сваёй каханай дзяўчыне. «Вось толькі ці прыйдзецца калі? Адкуль тая мая сарамяжлівасць, адкуль яна, тая нясмеласць?»

А Яніна іграла і спявала. Здавалася, усё навакколле гарэзнічала разам з гэтай прыгажуняй. І верылася, так хацелася верыць у тое, што і яна зверне ўвагу на Алеся, падаруе яму і толькі яму лепшую ў свеце ўсмешку. Такую, што аж затрапечацца сэрца, што нябачныя крылы перанясуць Алеся ў край мілоснасці і кахання.

Пакрысе набліжалася поўнач. Ужо не шугала, а толькі зрэдку зырчэла вогнішча. Моладзь дзе купкамі, а дзе і па двое, пазнікалі ў навакольнай цемры. Да слыху замроенага Алеся нечакана даляцеў раздражнёны голас Міколы. Няйначай зноў крыўдзіць мясцовы гжэчны кавалер Яніну. «Слухай, Янінка, давай я праводжу цябе дадому!» «Ой, дзякуй, Алеська! Трымай акардэон — дапаможаш паднесці». «Вось яно, блізкае, яснае шчасце...» — словамі паэта падумаў Алесь. Узрушаны і шчаслівы, ён падхапіў адной рукой музычны інструмент, а другой — узяў гарачую і трапяткую руку дзяўчыны. І яны пайшлі ад чаборовай палянкі па сцяжынцы ў вёску...

Потым гулялі разам і наступным вечарам. Адны. Праўда, нібы прысутнічаў і трэці. Больш гаварыла Яніна. Сціплы Алесь усё больш адмоўчваўся. Дзяўчына нават не то пасмяялася, не то сыранізавала: «Маўчанне — золата!» А потым сарвалася з месца і шпарка пабегла ўбок ад сцяжынкі. Алесь — за ёю. Раптам яна ўпала, ён каля яе таксама. «Алеська, родненькі...» — шаптала Яніна. Алесь моцна абняў дзяўчыну. Гарачае яе дыханне абхапіла ўсяго Алеся. Вось-вось, здаецца, вусны сустрэнуцца з вуснамі. Вось яно, блізкае, яснае шчасце...

Ды раптам побач гучна залапатала крыламі нейкая вялікая чорная птушка. Быццам бы хто яе выпусціў з рук... Яніна з Алесем ускапіліся. Страх потым прайшоў. Ды ўжо знаёмая сцежка вяла іх у вёску...

За летам прыйшла восень. Пасля Пакроваў да Алеся (ён вучыўся ўжо ў горадзе) прыслела вестка: Яніна выйшла замуж за Міколу. Яшчэ праз год у іх нарадзіўся сын. А праз восем гадоў яны развяліся.

Алесь жа пасля заканчэння ўніверсітэцкай вучобы пабраўся шлюбам са сваёй аднакурсніцай. Яны нарадзілі дачку і сына, якія праз трыццаць гадоў зрабілі іх багатымі ажно на шэсць унукаў.

Але калі-нікалі асвеціцца Алесева памяць той чаборовай палянкай, тымі цёплымі летнімі вечарамі, тым першым каханнем. І сапраўды: хіба ж на вечар той можна забыцца? Пахне чабор...

**Уладзімір ЛАЙКОЎ**

# КАЛІ ДВОРНІК — ДЫЗАЙНЕР І АРНІТОЛАГ

— Проста цуд! Ну проста цуд нейкі. Кожны год у адзін і той жа дзень яны пачынаюць паміж сабой таўчыся. Б'юцца насмерць, ірвуць адна адну на шматкі.

— Ды хто «яны», Валя? Пра каго размова?

— А птушкі. Хіба ж не разбудзілі?

— Яшчэ як. Думаў, каты птушанят крадуць.

— Гэта ж заўсёды ў адзін дзень вароны выкідваюць сарок з гнёздаў. Летась таксама так было. А тыя абараняюць іх, як Брэсцкую крэпасць.

— От, развялі птушнік у двары...

— А то яны вельмі пытаюцца. Наляцела з парку Горкага — процьма, — махнула рукой Валя і пабегла па сваіх бясконцых справах.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Дворнік са стажам і актыўнай жыццёвай пазіцыяй Валянціна АКСЮЧЫЦ разам з мужам і калегам Анатолем.**

Першы раз бачу, каб дворнічыха была яшчэ і такім уважлівым арнітолагам. Калі толькі паспявае? Стаіць карчом, пальцамі паўдня вышчыпвае траву паміж пліт тратуара, а сама краем вока паглядае на кусты бэзу ці маладыя дрэўцы невядома якой пароды пад вокнамі «хрушчовак», на якіх птушкі вядуць свой рэй. Птушынае жыццё ёй цікавае.

Хуценька раскідала па паштовых скрынках у пад'ездах «жыроўкі». Падгрэбла скошаную мужчынамі траву на газонах. А затым яе густа-зялёны новы халацік перамяшчаецца на клумбы пад балконамі ўжо дзевяціпавярховіка. І нешта там наш дызайнер папраўляе, дасаджвае, прапольвае, прыхарошвае, палівае... Сама тых клумбаў нарабіла, ніхто не загадваў, на Камароўку па насенне ездзіла. Сама на іх і душыцца, ніхто асабліва не памагае. Гэта зімой Толік, муж, — ён у суседнім двары гаспадарыць, ён пасабляе, на снег выходзіць і сына прывядзе. Снег — справа цяжкая. А вясной і ўлетку часцей адна.

У сваю чаргу і яна Толіку паможа. Пайшоў той у адпачынак — Валя за мяцёлку і ў яго двор. «Там таксама людзі жывуць».

Кветкі на клумбах у яе цвітуць ад ранняй вясны да снегу. Настурцыя, гартэнзія, турэцкая гваздзіка, лаватэра і «дэмакратычныя» аксаміткі. Стары чамадан сярод клумбы паставіла, туды зямлі насыпала і таксама кветак насадзіла. На даволі моцным карлікавым дрэўцы на ўзроўні грудзей «расце» вазон з жывым яркім букетам. І стары плецены кош поўніцца кветкамі. Вецер непадалёку гуляе з шырокімі лістамі папараць-кветкі... Нішто сабе атрымалася, арыгінальна. Адным словам, дызайнер-аматар.

Такое ўражанне — чалавек на заводзе раней працаваўпрацаваў (бо хватка заводская адчуваецца), пакуль не засумаваў па свежым паветры. Усё правільна, толькі не на заводзе, а ў паліграфічнай вытворчасці — у цэху буйнейшага мінскага выдавецтва «Беларускі Дом друку». Працавала, пакуль доктар Кутавая (дарэчы, жонка Барыса Кутавога, на той час — генеральнага дырэктара таго самага выдавецтва, дзе і наша «Звязда» друкуецца) не параіла змяніць занятак. Бо шум друкарскіх машын пачаў элементарна наганяць ціск.

...Часам на яе злуюся. У шэсць гадзін яшчэ і спаць ахвота, а яе высокая жалезная цялежка з смеццем грыміць пад вокнамі — самы лепшы будзільнік. Субота ці нядзеля — аднолькава грыміць. Калі б быў рацыяналізатарам, абавязкова прыдумаў бы Валянціне «тачанку» на гумавай хадзе.

У двары нашым харошыя людзі жывуць. Гэта я не толькі пра сябе любімага. Перш за ўсё пра Людмілу Бржазоўскую, знакамітую прымабалерыну і настаўніцу новых балетных зорачак. Тут і модны архітэктар, і былы спікер парламента, а некалі жыў і тагачасны кіраўнік урада. І я працую ўсе задаволены, а гэта, калі хочаце, знак якасці той самай работы.

Як недарэчнасць усплывае паніка, што прайшла па доме напрадвесні, — скарачаюць нашу Валянціну. Адзін пад'езд у знак пратэсту напісаў пісьмо ў домакіраўніцтва. Другі таксама нешта пісаў, але, здаецца, вышэй. Усе — хто пісаў ці не, раптам зразумелі: вось пашанцавала нам больш за 20 гадоў назад з дворнікам, і ўсё. А пойдзе Валя на заслужаны — іншай такой ніхто нам не прышле. Сёння ў двары і пад'ездах парадак. Вы калі-небудзь бачылі, каб у 9-павярховым доме на пяць пад'ездаў і навокал быў парадак? Бо — глядзіць, не лянуецца, усе свае выхадныя (!) дні тут праводзіць з мятлой у руках. А іншая наўрад ці будзе так шчыраваць за сціплыя дворнікавы грошы.

І невыпадкова ў апошнія дні чэрвеня прыязджала здымачная група СТВ, здымала і паказала па тэлебачанні сюжэт пра Валянціну Аксючыц. Бо наш двор дзякуючы яе стараннем вельмі няблага выглядаў на гарадскім конкурсе, дыплом Валі ўручылі. Шмат добрых слоў сказалі пра яе жыхары дома ў камеру.

І калі пайшла тая гамана пра скарачэнне, то раптам даведаўся: па просьбе пляменніка, які жыве ў Гродне, даглядае наша Валя у суседнім пад'ездзе нямоглую жанчыну, у якой сваіх дзетак няма. От як.

Ну, у домакіраўніцтве таксама разбіраюцца ў людзях. Валя пагамоніць-пагамоніць, а ў яе спрэс чысціня, і начальства гэта любіць. Адным словам, прадоўжылі кантракт нашаму арнітолагу. То і нам спакайней.

А ў вас ёсць такая Валянціна-гаспадыня?

**Уладзімір БЯРЭЗІН**, *г. Мінск.*

## Факт

### «СТАРЫЯ» ПАКРЫСЕ СЫХОДЗЯЦЬ

**Нацыянальны банк Беларусі выключыў з абарачэння каля 70 працэнтаў купюр старога ўзору ад сумы наяўных грошай, якія знаходзіліся па-за касамі Нацбанка па стане на 1 ліпеня.**

Як паведамляецца «пры гэтым асноўная маса выключаных з абарачэння наяўных грошай прыпадае на банкноты буйных наміналаў (Br50 тыс., Br100 тыс. і Br200 тыс.), у меншай ступені выключаюцца банкноты дробных і сярэдніх наміналаў».

Рашэнне аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі з 1 ліпеня 2016 года было замацавана Указам ад 4 лістапада 2015 года №450. Дэнамінацыя праведзена шляхам замены існуючых у абарачэнні банкнотаў узору 2000 года на банкноты і манеты ўзору 2009 года ў суадносінах 10 000 і 1 беларускі рубель.

### НОВАЕ ЖЫЦЦЁ КАФЭ «БЯРОЗКА»

**На плошчы Перамогі адкрылася новая ўстанова сеткі Golden Coffee — кафэ «Бярозка».**

У гэтага месца — легендарная гісторыя. Спачатку памяшканне выкарыстоўвалася пад аўтасалон «Перамога». У 1957-м на гэтым месцы з'явілася першая закусачная-аўтамат, а праз дзесяць гадоў — кафэ пад назвай «Бярозка». Гістарычнае мінулае і вызначыла канцэпцыю ўстановы. Лагатып выкананы ў стылі 1960-1970-х і нагадвае пра аўтамабільнае мінулае. Экстэр'ер застаўся фактычна без змен, гісторыка-культурную каштоўнасць было вырашана захаваць. Што да інтэр'ера, то памяшканне цяпер падзелена на тры зоны, кожная з якіх аформлена ў індывідуальным стылі. Першая — светлае кафэ-кандытарская для дзелавых сустрэч і сямейнага адпачынку. Па цэнтры — вінны бар з аб'ёмнай столлю, вінны шафай і барнай стойкай. Трэцяя зона — lounge. Тут мяккія шырокія канапы, вялікія сталы, карціны, расслабляючае святло і музыка — джаз, блюз, дыджэй-сэты. У меню будуць як вядомыя стравы сеткі Golden Coffee, так і аўтарская кухня.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

### ГІНУЦЬ ДЗЕЦІ

**На Брэстчыне некалькі апошніх дзён азмрочаны сумнымі весткамі пра гібель дзяцей. У раце Шчара патануў 15-гадовы выхаванец дзіцячага дома. Як высветлілі работнікі міліцыі, хлопец і яго таварышы пайшлі купацца без дазволу. Юнак не ўмеў плаваць, аступіўся і ўпаў у ваду.**

А ў Белаазёрску 12-гадовы хлопчык упаў з балкона 5-га паверха. Відавочцы расказвалі, што школьнік стаяў і трымаўся за вяроўкі, на якіх сушаць бялізну. У нейкі момант вяроўкі не вытрымалі і абарваліся. Хлопчык не ўтрымаў раўнавагу і ўпаў уніз. Медыкі канстатавалі смерць школьніка. Беражыце дзяцей!

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

А-100

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Гуляем на ўсе»

1. Организатор Игры: Сведения об организаторе рекламной игры: Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг» (ОДО «Астотрейдинг»), находящееся по адресу: 223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, дом 7, административные помещения, УНП 690362737.

2. Наименование Игры: «Гуляем на ўсе»

3. Сроки проведения рекламной игры: с 26 мая по 4 августа 2016 г.

4. Рекламная игра зарегистрирована Министерством торговли Республики Беларусь. Свидетельство № 2760 от 19.05.2016.

5. В рекламной игре приняли участие 10 666 участников.

6. Призовой фонд разыгран частично. Обладателями призов стали 199 человек.

7. Список победителей с информацией о выигрыше опубликован на официальном сайте сети АЗС «А-100» **http://azs.a-100.by/.**

8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры – (017) 233-33-33.

## ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении открытого аукциона

# ПО ПРОДАЖЕ ГАРАЖЕЙ

## ОАО «Белорусский цементный завод»

**Лот №1:** гараж №1 с инвентарным № 732/С-9342 общей площадью 38,9 кв.м. Начальная цена продажи **4 656,00** (Четыре тысячи шестьсот пятьдесят шесть) рублей (с НДС). Задаток за участие в аукционе 5% от начальной цены продажи **233,00** (Двести тридцать три) рубля (с НДС).

**Лот №2**: гараж №2 с инвентарным №732/С-9343 общей площадью 23,9 кв.м. Начальная цена продажи **3 432** (Три тысячи четыреста тридцать два) рубля (с НДС). Задаток за участие в аукционе 5% от начальной цены продажи **172** (Сто семьдесят два) рубля (с НДС).

**Лот №3:** гараж №3 с инвентарным №732/С-9344 общей площадью 22,7 кв.м. Начальная цена продажи **3 252** (Три тысячи двести пятьдесят два) рубля (с НДС). Задаток за участие в аукционе 5% от начальной цены продажи **171** (Сто семьдесят один) рубль (с НДС).

**Лот №4**: гараж №4 с инвентарным №732/С-9345 общей площадью 24,5 кв.м. Начальная цена продажи **3 504** (Три тысячи пятьсот четыре) рубля (с НДС). Задаток за участие в аукционе 5% от начальной цены продажи **175** (Сто семьдесят пять) рублей (с НДС).

**Лот №5:** гараж №5 с инвентарным №732/С-9347 общей площадью 24,3 кв.м. Начальная цена продажи **3 480** (Три тысячи четыреста восемьдесят) рублей (с НДС). Задаток за участие в аукционе 5% от начальной цены продажи **174** (Сто семьдесят четыре) рубля (с НДС).

Объекты представляют собой одноэтажные кирпичные строения, фундамент бетонный, перекрытия – железобетонные плиты, крыша рулонная совмещенная, полы бетонные, проемы дверные металлические.

Объекты расположены по адресу: **213640, Республика Беларусь, Могилевская область, г. Костюковичи, ГК «Цементник»,** на земельном участке с кадастровым номером 723550100001000283, предоставленном ГК «Цементник». Объекты продаются без условий.

Аукцион состоится **05 сентября 2016 г. в 14.00** по адресу: г. Костюковичи, административный корпус ОАО «Белорусский цементный завод», актовый зал. Продавец объектов – ОАО «Белорусский цементный завод».

Аукцион проводится в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Аукцион проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести объект. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе аукциона участники могут предлагать свою цену за продаваемый объект в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату перечисления Организатору аукциона на р/с №3012150544012 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 02.09.2016 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411 (здание ГО «Белресурсы»). Заключительная регистрация участников – **05.09.2016 с 13.30 до 13.45** по месту проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Белорусский цементный завод» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи с 10.00 до 17.00. Контактный телефон продавца в г. Минске **327-36-86**. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: **8 (017) 398-28-50, 398-29-44, +375-29-615-40-08** e-mail: **belinvo@tut.by**, на сайте **belinvo.by**.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Миноблавтотранс» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом**

**здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автомобилей** (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), общей площадью **258,5 кв.м,** инв. № 500/С-16432, **административно-хозяйственного здания** (в состав капитального строения входят: административное здание, площадка с бордюром, эстакада, 3 площадки, ограждение, колонка для воды, ворота, калитка), общей площадью **271.1 кв.м,** инв. № 500/С-16430, **многолетних насаждений** (можжевельник обыкновенный 3 шт., рябина обыкновенная, клен остролистный, клен ясенелистый, слива 3 шт., яблоня, вишня 4 шт., ель обыкновенная 6 шт.), **котла отопительного** КВ-02 (б/у), **станка наждачного** (б/у), **станка токарного** (б/у), **шкафа электрического** ШЭВ (б/у), расположенных на земельном участке **0,2463 га** с кадастровым номером 500000000007006276 **по адресу: г. Минск, ул. Новаторская, 57.**

**Начальная цена с НДС (20%) – 325 000 бел. руб. (в денежных единицах 2000 года – 3 250 000 000 бел. руб.). Стоимость снижена на 50%. Задаток 10% от начальной цены (32 500 бел. руб.).**

**Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 04.07.2016 г. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **30.08.2016** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.08.2016** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

---

**Уважаемые акционеры**

## ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»!

**Информируем о том, что наблюдательным советом общества принято решение об изменении повестки дня собрания акционеров, назначенного на 12 августа 2016 года, информация о созыве которого опубликована 02.08.2016.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об изменении уставного фонда ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».
2. Об утверждении новой редакции устава ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».

*(Основание – Закон о хозяйственных обществах).*

***Дирекция, Наблюдательный Совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».***

УНП 600075003

---

**Считать недействительным** свидетельство о государственной регистрации частного торгового унитарного предприятия «ПРОАВТО» (регистрационный номер в ЕГР 190814019) **в связи с утерей.**

УНП 191305187

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 422/U-39260 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Я. Купалы, 26 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425850100003000331, (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания жилого дома), площадью 0,1141, расположенный по адресу: г. Щучин, ул. Я. Купалы, 26 |
| **Начальная цена продажи** | 38 091 р. (тридцать восемь тысяч девяносто один рубль) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3 809,10 р. (три тысячи восемьсот девять рублей десять копеек) |
| **Продавец** | ОАО «Щучинагропродукт», 231513, Щучинский р-н, д. Янчуки, тел. 8-01514-411-79 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739 УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 06 сентября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница) Последний день приема заявлений – 31 августа 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Логойского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

# ПО ПРОДАЖЕ МАГАЗИНА № 42 «Сувениры»,

**общ. пл. 289,3 кв.м, инв. № 601/С-13149, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623280804601000025, площадью 0,0698 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Логойский район, Гайненский с/с, М3, 53 км, 1.**

**Начальная цена с НДС – 36 239,81 бел. руб. (365 398 080 бел. руб.)**

**Задаток 10% от начальной цены (3 623,00 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.04.2016. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **15.08.2016** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.08.2016** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | | |
| **Продавец** | **ОАО «МПОВТ», 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, 62, тел.: +37517-363-62-30** | | | |
| **Предмет аукциона (месторасположение: г. Минск, ул. Притыцкого, 62)** | | | | |
| **Лот №1** | | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | |
| **Административно-бытовой корпус (Литер Ж 4/к)** | Здание административно-хозяйственное | 613,3 кв.м | 500/С-31573 | |
| **Начальная цена с НДС – 322 452 руб. 24 коп. (3 224 522 400 бел. руб.)** | | | | |
| **Лот №2** | | | | |
| **Финский модуль №1** | Здание специализированное иного назначения | 873,0 кв.м | 500/С-31574 | |
| **Начальная цена с НДС – 363 360 руб. 36 коп. (3 633 603 600 бел. руб.)** | | | | |
| **Лот №3** | | | | |
| **Здание административно-бытового корпуса № 2 (Литер Г 4/к)** | Здание административно-хозяйственное | 799,0 кв.м | 500/С-31575 | |
| **Начальная цена с НДС – 421 113 руб. 00 коп. (4 211 130 000 бел. руб.)** | | | | |
| Земельный участок **пл. 0,4555 га** предоставлен продавцу на праве аренды (доля: 3/5) сроком по 31 августа 2053 г. для эксплуатации и обслуживания зданий административно-хозяйственных и зданий специализированных иного назначения, из них 0,1547 га с ограничениями в использовании земель – охранная зона сетей и сооружений канализации, охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, охранная зона сетей и сооружений газоснабжения | | | | |
| **Обременения:** площади зданий сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона | | | | |
